СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 8.14, 15.49, 7.35;
Віцебск — 8.11, 15.32, 7.21;
Магілёў — 8.03, 15.39, 7.36;
Гомель — 7.53, 15.44, 7.51;
Гродна — 8.28, 16.06, 7.38;
Брэст — 8.20, 16.14, 7.54.
МЕСЯЦ:
Поўня 10 снежня.
ІМЯНІНЫ:
Клімента, Пятра; Марыі

ЗВЯЗДА

8 СНЕЖНЯ 1992 г.
аўторак, № 243 (22021)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

РОЗГАЛАС

У БЯРОЗЕ ДАЧНЫ СЕЗОН ЯШЧЭ НЕ ЗАКОНЧЫЎСЯ

Нямецкім спецыялістам, якія будуюць жыллё для ваеннаслужачых былой Групы савецкіх войск у Германіі, адведзена частка дома на адной з вуліц Бярозы, а для іх машын — ахоўваемая стаянка з высокім плотам. Немцы ж лічаць прапанаваныя ўмовы абмежаванымі, і таму здымаюць у беразаўчан асобныя кватэры. Кватэранаймальнікі плацяць, вядома, у валюце і, улічваючы сённяшні курс рубля, вельмі нядрэнна — да 150 марак у месяц. Цікава, што дзеля таго, каб трапіць у лік валютных кватэрадатчыкаў, жыхары Бярозы пакідаюць родны горад і сем'ямі пераязджаюць на дачы.

Людміла ГІЛЕВА. (РІД).

У ПРЭЗІДЫУМЕ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА

7 снежня адбылося пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Разгледжаны наступныя пытанні: аб паляпшэнні ўмоў дзейнасці рабочай групы Канстытуцыйнай камісіі ў мэтах паскарэння работы па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, аб прысваенні ганаровых званняў «Заслужаны работнік культуры» і «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь», аб памілаванні асуджаных да вышэйшай меры пакарання і кадравыя.

Прынята рашэнне накіраваць для ўдзелу ў семінары «Канстытуцыяналізм», які праводзіцца ў Будапешце 14—15 снежня Інстытутам канстытуцыйнай і прававой палітыкі Цэнтральнаеўрапейскага ўніверсітэта, дэлегацыю з членаў рабочай групы Канстытуцыйнай камісіі на чале з яе кіраўніком — намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Васілём Шаладонавым.

Зацверджаны састаў дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на перагаворах з Украінай па пытаннях дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Беларуссю і Украінай.

Прэс-служба Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь—БЕЛІНФАРМ.

ДА ЎРУЧЭННЯ ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ

7 снежня Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Венгерскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Акаш Энгельмаер уручыў вярыцельныя граматы Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславу Шушкевічу.

Акаш Энгельмаер нарадзіўся 13 чэрвеня 1933 года ў горадзе Сегедзе, пасля заканчэння ўніверсітэта ў Варшаве атрымаў навуковую ступень магістра этнаграфіі.

З 1963 года жыве ў Польшчы. Займаўся вусным і мастацкім перакладам, журналістыкай. Працаваў у Венгерскім інстытуце культуры ў Варшаве. З канца 70-х гадоў удзельнічаў у польскім і венгерскім палітычных апазіцыйных рухах.

З 10 кастрычніка 1990 года — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Венгерскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Польшча.

Валодае польскай мовай.

Жанаты, мае дваіх дзяцей.

Аддзел інфармацыі МЗС Рэспублікі Беларусь—БЕЛІНФАРМ.

Незгаральныя сейфы, бронекамізэлькі, зручная мэбля для сакратарак і іх шэфаў

—усё гэта змогуць убачыць і набыць наведвальнікі выставы «Сучасны офіс», якую наладжвае з 16 па 18 снежня ў Мінску вядомая фірма «Мінскі кірмаш».

Тыя, хто пабывае на выставе (уваход на яе бясплатны), змогуць таксама ўбачыць сучасныя камп'ютэры, рэдакцыйна-выдавецкія сістэмы і праграмнае забеспячэнне для іх, халадзільнікі, сродкі сувязі і шмат чаго іншага, што дазваляе зрабіць месца працы кіраўніка і бізнесмена сапраўды сучасным і зручным.

Як стала вядома з неафіцыяльных крыніц, чакаецца прыбыццё на кірмаш і гандляроў зброяй з Расіі. Ці будзе яна выстаўлена напаказ — невядома. Зрэшты, попыт на гэты тавар не выклікае неабходнасці ў рэкламе. Бяссілле міліцыі перад ростам злачыннасці вымушае не толькі мужных інкасатараў, але і мілавідных касірак усур'ёз задумацца аб набыцці зброі. Пэўна, калі такая магчымасць прадставіцца, яны з задавальненнем памяняюць флакон з духамі на балончык з «Чаромхай».

Паводле даных аргкамітэта, заявы на ўдзел у выставе ўжо даслалі каля дзвюх соцень арганізацый.

В. ХУРСІК.

Выкрадзены барэльефы герояў

РЭЧЫЦА (Белінфарм). У гарадскім парку Перамогі на мемарыяльнай алеі Славы выкрадзены шэсць бронзавых барэльефаў Герояў Савецкага Саюза, мясцовых ураджэнцаў.

Відаць, некаторыя нашы суайчыннікі, выкрадаючы каляровыя металы, проста страцілі розум. У пагоні за нажывай яны не ашчаджаюць нават нашу памяць.

Ехаў у Германію, а трапіў у КДБ

На гэтым тыдні адбудзецца суд над грамадзянінам Азербайджана Б. Яго затрымалі ў поездзе Санкт-Пецярбург — Варшава — Берлін пры пераездзе граніцы ў Гродна. Б. «не падазраваў», што самаробнае страляючае ўстройства памерам з аўтаручку з'яўляецца агнястрэльнай зброяй, а 12 патронаў калібру 5,6 мм, па яго словах, «ён проста не паспеў прад'явіць мытнаму кантролю». Пракуратура Гродзенскай вобласці, выслухаўшы падазронага, узбудзіла крымінальную справу і перадала яе КДБ.

ЯШЧЭ АДЗІН СПОСАБ АДБІРАННЯ ГРОШАЙ У НАСЕЛЬНІЦТВА

Калі вы ці вашы дзеці любіце гематаген, то, напэўна, ужо заўважылі, што гэты смачны і карысны прадукт даўно знік з аптэк і гэтай восенню яго можна было ўбачыць толькі ў некаторых прыватных і каапаратыўных магазінах. Як ён там апынуўся, выявіла гродзенская Інспекцыя па гандлю і абароне правоў спажыўца, якая ўстанавіла, што мінскае ВА «Белмедпрэпараты» прадало МП «Консумер» 90 тысяч плітак гематагену па цане 5 руб. 10 кап. за штуку.

Зрабіўшы ўзаконеную надбаўку ў 8 працэнтаў, малое прадпрыемства пераправіла лекавыя цукеркі ў Гродна і прадало іх ММП «Канстанта» па 5 рублёў 50 капеек. Тут адбылася падмена накладной, і тая ж партыя гематагену фігуруе ўжо па цане 11 рублёў за плітку.

Пасля неаднаразовага перапродажу прадукт набыў новую аптовую цану, якая склала 17 рублёў 25 капеек. Дадайце сюды яшчэ гандлёвую надбаўку, і атрымаецца, што дзялкі паклалі ва ўласную кішэню 1.003708 рублёў, гэта значыць прыбытак перавысіў адпускную цану прадпрыемства, якое выробляла гематаген, у 2,2 раза.

ПЕРАСЯЛІЛІСЯ, А ПРАЦАВАЦЬ НЯМА ДЗЕ

ЖОДЗІНА. У горадзе павялічылася колькасць праблем пасля перасялення сюды людзей з чарнобыльскай зоны (350 сем'яў з горада Веткі). Планавалася, што яны будуць працаваць на баваўняна-прадзільнай фабрыцы, для іх збіраліся пабудаваць садок, школу, дзіцячую паліклініку, пашырыць гарадскую бальніцу.

Аднак з-за адсутнасці сродкаў і рашэння аб спыненні будаўніцтва баваўняна-прадзільнай фабрыкі становішча ўскладнілася. А між тым людзі прыязджаюць, і іх трэба недзе працаўладкоўваць.

Таму ў Жодзінскім гарвыканкоме зараз разглядаецца пытанне аб стварэнні швейнай вытворчасці для жанчын-перасяленак на базе недабудаванага прафтэхвучылішча.

ПУНКТ ПОГЛЯДУ

Сваё слова сказала гісторыя

Роўна год назад назва беларускіх Віскулёў прагучала на ўвесь свет. Тады ж над маскоўскім Крамлём упершыню пасля сямідзесяці чатырох гадоў перастаў развявацца чырвоны сцяг.

Сёння тыя падзеі адны ўспамінаюць з надзеяй і ўдзячнасцю, другія — з абурэннем і праклёнамі.

Якіх толькі «эпітэтаў» не давялося за апошні год пачуць у свой адрас стваральнікам Садружнасці. «Пушчысты», «магільшчыкі краіны», «аўтары развалу Саюза»...

Дарэчы, менавіта такой лексіцы аддае перавагу і большасць беларускіх парламентарыяў, калі ў час дэбатаў закранаецца гэта тэма.

Можна толькі здзіўляцца, як гэтыя самыя людзі год назад дружна прагаласавалі за ратыфікацыю белавежскага пагаднення і тым самым фактычна паставілі і свае подпісы пад дакументам, які абвясціў аб роспуску СССР. Наўрад ці гэта былі разгубленасць і спалох пасля правалу авантуры з ГКЧП,— да таго моманту яны ўжо мінулі. «Державники» апрытомнелі, камуністы зноў загаварылі пра сваю нікім не бачаную перспектыву... Справа, відаць, усяго толькі ў тым, што многія за новай абрэвіятурай спадзяваліся ўбачыць стары змест — рэанімаваную ўнітарную дзяржаву, злёгку прыхарошаную арнаментам з урэзаных нацыянальных аўтаномій. А як яна будзе называцца — СССР, СНД ці Бераг Слановай Косці — якая розніца?

Спадзяванні гэтыя не спраўдзіліся і не маглі спраўдзіцца. І зусім не таму, што лідэры трох славянскіх дзяржаў загадзя спланавалі роспуск СССР і адстаўку Гарбачова, у чым іх цяпер больш за ўсё абвінавачваюць і «справа», і «злева». Успомніце снежань мінулага года. Сутаргавыя спробы Гарбачова ўдыхнуць другое жыццё ў «новаагароўскі працэс» церпяць крах. Украіна на рэферэндуме галасуе за поўную незалежнасць. Леанід Краўчук забывае пра былыя рознагалоссі з «Рухам» і заяўляе, што не падпіша ніводнага пагаднення, якое б хоць у нязначнай ступені ўшчамляла палітычны суверэнітэт яго краіны. Прэзідэнт СССР праз тэлебачанне заклікае ўкраінцаў адумацца, палохае краіну жахамі, якія прынясе палітычная самастойнасць былых саюзных рэспублік, заяўляе, што новы Саюз без Украіны існаваць не можа. Але позна — цягнік пайшоў. З такім жа поспехам можна было спрабаваць запіхнуць назад зубную пасту, выціснутую з цюбіка.

Да пачатку снежня Саюз як адзіная дзяржава быў асуджаны. Бадай, ужо не было той сілы, якая б здолела спыніць на ўсю моц раскручаны махавік, што няўмольна павялічваў цэнтрабежныя сілы. Уберагчы былую сям'ю, члены якой дарэшты перасварыліся паміж сабой, было ўжо немагчыма. Заставаўся шанц правесці развод без боек і «разборак», палюбоўна дамовіўшыся аб падзеле маёмасці і старых даўгоў.

І гэты шанц быў выкарыстаны год назад у Віскулях.

Так, стварэнне Садружнасці не спыніла дэзінтэграцыйных працэсаў у эканоміцы і не ўберагло маладыя незалежныя дзяржавы ад полымя лакальных унутраных міжэтнічных канфліктаў. Але такая задача на першым этапе існавання новага міждзяржаўнага ўтварэння і не магла быць вырашана. Той час, калі стары будынак яшчэ можна было рэстаўрыраваць і перабудаваць — беззваротна мінуў. І хоць галоўны архітэктар перабудовы пераконваў, што менавіта гэтай перабудовай ён і займаўся,— на самой справе ўвесь той час будынак рушыўся. Мы цяпер перажываем момант, калі ўжо ўсім зразумела, што аднавіць былы гмах немагчыма, а будаўніцтву новага пакуль што замінаюць старыя развалiны. Гэтыя руіны працягваюць разбурацца,— і Садружнасць з большым ці меншым поспехам спрыяе таму, каб адбывалася гэта ў прымальных цывілізаваных формах.

Сцэнарый распаду былой савецкай імперыі мог быць і іншы—намнога больш трагічны і крывавы. Калі б не існавала СНД і лідэры маладых дзяржаў за адным сталом не шукалі кампрамісаў, а выбралі іншыя спосабы вырашэння шматлікіх супярэчнасцей,— хто ведае, чым бы скончылася супрацьстаянне ў Прыднястроўі, якімі б былі вынікі падзелу Чарнаморскага флоту і спрэчак аб прыналежнасці Крымскага паўвострава. Трагічны прыклад Югаславіі ва ўсіх перад вачыма. Ужо за адно тое, што ў былым СССР не дайшло да буйнамаштабных узброеных высвятленняў адносін паміж новымі дзяржавамі,— можна і трэба быць удзячнымі стваральнікам Садружнасці.

Той крытычны пункт дэзінтэграцыі, раз'яднання, да якога імкліва падалі мінулы год усе без выключэння краіны СНД,—недалёкі. Пераадолеўшы яго, маладыя дзяржавы немінуча зноў пачнуць «збіраць камяні», шукаць шляхі збліжэння, будаваць новыя адносіны. У гэтым сэнсе мінулы год станаўлення СНД быў зусім не такім марным, як у гэтым пераконваюць скептыкі, што прадказвалі канец Садружнасці перад кожнай сустрэчай «у вярхах».

Так, за гэты год было больш дэкларацый аб захаванні адзінай эканамічнай прасторы, чым рэальных крокаў дзеля таго, каб яе захаваць. Так, розныя тэмпы і прынцыпы гаспадарчай рэформы без узаемнай узгодненасці дзеянняў балюча ўдарылі па ўсіх без выключэння. Так, крызіс у краінах Садружнасці ўвесь гэты год паглыбляўся.

Але абвінавачваць за ўсе гэтыя аб'ектыўныя эканамічныя беды Садружнасць і яе стваральнікаў — дэмагогія. З такім жа поспехам можна абвінавачваць дзіця за грахі яго бацькі, да якіх яно мае самае далёкае дачыненне.

СНД толькі пачынае рэалізоўваць закладзены ў яго магутны патэнцыял. Канкрэтныя абрысы будынка, падмурак якога быў закладзены ў Віскулях, — яшчэ толькі вымалёўваюцца. Яны стануць рэальнымі і бачнымі пасля таго, як на чарговай мінскай сустрэчы «ў вярхах», што адбудзецца праз два тыдні, будзе прыняты (прынамсі, хочацца верыць, што гэта адбудзецца) Статут Садружнасці. Пасля таго, як будуць, нарэшце, створаны і пачнуць нармальна працаваць каардынуючыя і арбітражныя інстытуты — Кансультатыўная эканамічная рабочая камісія, Эканамічны суд, Міжпарламенцкая асамблея, Камітэт пастаянных прадстаўнікоў. Натуральна, абмеркаванне гэтых наватворных праблем не будзе гладкім і лёгкім. Хутчэй за усё, зноў востра паўстане праблема таго, якімі паўнамоцтвамі будуць валодаць гэтыя каардынацыйныя органы, ці будуць яны мець рэальныя ўладныя рычагі,— супраць чаго выступаюць кіраўнікі шэрагу краін. Супярэчнасці, здаецца, усё больш схіляюць стваральнікаў СНД да гнуткай дэмакратычнай мадэлі супольнасці з рознымі ўзроўнямі ўдзелу ў ёй.

...Гадавіна стварэння Садружнасці хутчэй за ўсё не будзе ў нас сёння ўрачыста адзначацца. І справа не толькі ў тых эканамічных цяжкасцях, якія перажывае краіна, і ў пакуль што невысокай эфектыўнасці СНД. Пераканаўшыся, што СНД зусім не падобна на СССР, «державники» льюць слёзы па імперыі і прынародна, нават з трыбуны Вярхоўнага Савета — праклінаюць «пушчыстаў». Просты люд тым часам, мацюкаючыся, прывыкае да інфляцыі і настальгічна ўспамінае пра танныя хлеб, мяса і масла, што былі пры застоі...

І ўсё ж — успомнім: год назад здарылася тое, што да апошняга дня здавалася неверагодным і немагчымым. Саюз перастаў існаваць, і Беларусь дэ-факта стала незалежнай. Нацыя, якая ведае цану свабоды і даражыць сваім гонарам, ужо за адно гэта павінна быць удзячная дню 8 снежня.

Валянцін ЖДАНКО.

АКТУАЛЬНА

ЛІЦЭНЗІЯ

ШТО АЗНАЧАЕ ГЭТА СЛОВА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА НАВАЯЎЛЕНЫХ КАМЕРСАНТАЎ!

ГРАФІК ДЛЯ ЧЫГУНАЧНІКАЎ — усё роўна, што статут для салдата. Паспрабуй хоць на некалькі мінут затрымаць адпраўку поезда, як адразу пачынае ліхаманіць увесь даўжэзны ланцуг, імя якому чыгунка.

Вось і ў тую чэрвеньскую раніцу трэба было тэрмінова адпраўляць 26 цыстэрнаў з топачнай мазутай, а гэтыя хлопцы ў форме з кантрольна-прапускнога пункта ўсё валаводзілі. Бач ты, дакументы ім не падабаюцца! Усё, здаецца, на месцы: тавара-транспартная накладная, а галоўнае, ліцэнзія—афіцыяльны дазвол на адпраўку ў Літву адпаведнай колькасці паліва.

Дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «Гелува» спярша цярпліва ўгаворваў, маўляў, хопіць Ваньку валяць, адпраўляйце груз! Потым пачаў пагражаць штрафнымі санкцыямі за пратэрміноўку. Але, чым большую настойлівасць праяўляў камерсант, тым больш пахмурнеў твар у старшага інспектара кантрольна-прапускнога пункта чыгуначнай станцыі Маладзечна старшага лейтэнанта міліцыі Вячаслава Маліноўскага. Склалі пратакол і перадалі справу ў суд. Груз канфіскавалі, а дырэктара закрытага акцыянернага таварыства «Гелува» Арвідаса Палайму аштрафавалі на 10 тысяч рублёў. За рэалізаванае паліва ў казну пералічылі 4 мільёны 326 тысяч рублёў.

Аднак, як неўзабаве высветлілася, гэта была толькі прэлюдыя — само дзеянне яшчэ толькі разгортвалася. І размах здзелак — на дзесяткі мільёнаў рублёў.

29 верасня на той жа чыгуначнай станцыі Маладзечна і ўсё той жа старшы інспектар КПП Вячаслаў Маліноўскі зноў «тармазнуў» састаў з палівам. На гэты раз ужо 44 цыстэрны з мазутай. Грузаатрымальнік — закрытае акцыянернае таварыства «Гелува». Як і ў першым выпадку, адпраўляльнік паліва — вытворчае аб'яднанне «Горкнафтааргсінтэз», што ў Ніжагародскай вобласці. Давялося ехаць туды, каб на месцы высветліць усе перыпетыі.

І вось Вячаслаў Маліноўскі ў аб'яднанні «Горкнафтааргсінтэз». Там ён даведаўся, што яшчэ 30 чэрвеня ЗАТ «Гелува» заключыла дагавор з Дзяржкамнафтапрадуктам Рэспублікі Беларусь на пастаўку з Расіі ў нашу рэспубліку вялікай колькасці мазуты. А за гэта частку яе было дазволена вывезці за межы рэспублікі. Але камерсанты паспяшаліся з адпраўкай мазуты ў Прыбалтыку. Груз быў затрыманы, і справа перададзена ў народны суд.

І тут кіраўнік фірмы «Гелува» Арвідас Палайма паспрабаваў зрабіць ход канём. Першага кастрычніка, калі справа аб спробе незаконнага вывазу мазуты ў суседнюю Літву была ўжо ў судзе, які і вырашыў канфіскаваць груз, Арвідас Палайма піша пісьмо на імя начальніка Беларускай чыгункі С. Шкапіча: «ЗАТ «Гелува» адправіла са станцыі Зелянцы ў Рэспубліку Беларусь 27 тысяч тон топачнай мазуты. Цяпер на станцыях Смаргонь, Солы, Залессе, Маладзечна прастойваюць 380 цыстэрнаў і ў дарозе — 400 цыстэрнаў. У сувязі з нявырашэннем Дзяржкамнафтапрадуктам пытання рэалізацыі мазуты ЗАТ «Гелува» дазваляе рэалізаваць мазуту Беларускай чыгункі».

Цяжка меркаваць, на што разлічваў кіраўнік фірмы, калі пісаў падобны дакумент. Хутчэй за ўсё на тое, каб збыць хоць тую мазуту, што засталася, і тым самым мець сякі-такі навар. Гэта, як кажуць, яго справа, ён абараняў свае інтарэсы. Але як дзейнічала ў такой сітуацыі кіраўніцтва чыгункі? Пісьмо, якое было датавана 1 кастрычніка, да начальніка чыгункі так і не дайшло, ва ўсякім разе адпаведнай рэзалюцыі на ім не аказалася. Затое яно амаль адразу трапіла да начальніка аддзела перавозак Беларускай чыгункі Мікалая Нікіцюка і было прынята «да выканання». У той жа дзень на станцыі Полацк,

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ГОД БЕЗ САЮЗА

Сацыялогія: падводзім вынікі

10 снежня 1991 года і 2 снежня 1992 года Беларуская служба «Грамадская думка» правяла апытанні насельніцтва Рэспублікі Беларусь, якімі былі ахоплены ўсе асноўныя сацыяльна-дэмаграфічныя групы. У 1991 годзе была вывучана думка 1.208 чалавек, у 1992 годзе — 962. Памылка рэпрэзентатыўнасці склала 3,1 працэнта. На пытанне: «Ці адабраеце Вы дамоўленасці кіраўнікоў Расіі, Украіны і Беларусі, дасягнутыя 8 снежня 1991 года пад Брэстам, аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў?» — адказы размеркаваліся так:

	1991	1992
Адабраю	69%	42%
Не адабраю	10%	34%
Цяжка сказаць	21%	24%

Такім чынам, хоць і зменшылася падтрымка насельніцтвам рэспублікі падпісаных год назад дамоўленасцей у Віскулях, большасць апытаных ўсё ж адабраюць пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Трэба адзначыць, што прычыны змяненняў у пазіцыі часткі жыхароў Беларусі ў адносінах да СНД носяць у многім асабісты, суб'ектыўны характар. Апытаныя гэтай групы мяркуюць, што менавіта СНД прывяла да стварэння межаў паміж былымі саюзнымі рэспублікамі, увядзення візавага рэжыму, мытнага і пагранічнага кантролю. Паводле даных праведзенага ў кастрычніку гэтага года службай «Грамадская думка» апытання, кожны пяты ў рэспубліцы лічыць, што гэта сур'ёзна ўскладніла гандлёвы абмен, а кожны чацвёрты — што гэта ўскладняе кантакты са сваякамі.

Адным з фактараў, якія пацвярджаюць правільнасць выбару, зробленага ў Віскулях ў снежні 1991 года, з'яўляецца, на наш погляд, устойлівая высокі рэйтынг папулярнасці Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча. У ходзе апытання 2 снежня гэтага года жыхарам Беларусі задавалася таксама пытанне: «Каго з палітыкаў, дзяржаўных дзеячаў нашай рэспублікі Вы лічыце найбольш аўтарытэтнымі?»

Адказы рэспандэнтаў размеркаваліся наступным чынам:

1. Шушкевіча С. С. 32,2%.
2. Кебіча В. Ф. 10,9%.
3. Пазьняка З. С. 8,1%.

Былі названы таксама Ганчар, Лукашэнка, Казлоўскі, Гілевіч, Кучынскі, Булахаў, Адамовіч, Радкевіч, Заблоцкі, Сямдзянава. Каля палавіны респандэнтаў (42,9 працэнта) адзначылі, што найбольш аўтарытэтнага палітычнага дзеяча назваць не могуць.

Трэба адзначыць, што за апошні месяц рэйтынг С. С. Шушкевіча ўзрос на 17 пунктаў.

Беларуская служба «Грамадская думка».

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ—АБ СНД

Напярэдадні першай гадавіны ўтварэння СНД Цэнтральная Рада Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады прыняла заяву, у якой факт утварэння СНД расцэнены як «адзіна магчымы цывілізаваны спосаб дэмантажу апошняй імперыі, які папярэдзіў як яе некантралюемы развал, так і магчымыя спробы яе гвалтоўнага ўзнаўлення, што магло прывесці да катастрафічных вынікаў».

Беларускія сацыял-дэмакраты лічаць, што нізкая эфектыўнасць Садружнасці — у многім аб'ектыўная з'ява, і таму выступаюць за прыярытэт двухбаковых адносін Беларусі з усімі дзяржавамі былога СССР.

«Узаемадзеянне ў рамках Садружнасці не павінна ператвараць СНД у замкнёную групоўку, а мусіць разглядацца як адзін з фактараў будаўніцтва агульнаеўрапейскага дома»,— падкрэсліваецца ў заяве.

РАДЫЁФАКТ

Першы ў Беларусі Міжнародны сельскагаспадарчы кірмаш адкрыўся ў Горках. Сярод яго ўдзельнікаў — прадстаўнікі гаспадарак, аграфірмаў, фермерскіх гаспадарак нашай рэспублікі, а таксама зарубежных фірмаў. На працягу тыдня яны будуць наладжваць дзелавыя кантакты ў набыцці новых сартоў сельскагаспадарчых культур, тэхніцы, распрацоўцы перадавых тэхналогій вытворчасці. Па задуме арганізатараў кірмашу, ён стане штогадовым з пастаяннай прапіскай у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

***

Колькасць прадуктаў, што падлягаюць картачнаму размеркаванню, са студзеня будучага года не зменшыцца. Паводле паведамлення карэспандэнта «Радыёфакта» з Пінска, там ужо пачалася выдача талонаў на гарэлку, тытунь, алей, цукар, муку, макаронныя вырабы. Праўда, усе спробы насельніцтва даведацца, на колькі грамаў таго ці іншага дэфіцыту можна разлічваць кожнаму, — безвыніковыя. Фонды паставак да гэтага часу так і не даведзены.

Уражваюць цэны на свініну на рынках Брэста. У галоўным свінагадоўчым рэгіёне рэспублікі з дзесяткамі сучасных комплексаў цана дасягае 550—600 рублёў за кілаграм. Гэта звязваюць з наплывам гасцей з суседняй Польшчы. Для іх і такая цана ўсё роўна ў чатыры-пяць разоў меншая, чым на ўласным рынку.

Пагражальныя памеры набывае ў Расіі распаўсюджанне фальшывых грошай. Асабліва спадабаліся злачынцам 5-тысячныя купюры.

Аказваецца, іх вельмі лёгка падрабіць: «адкатаў» на ксераксе, крыху расфарбаваў—і на выгляд такая паліграфічная прадукцыя мала чым адрозніваецца ад сапраўднай. Каб не застацца ў дурных, крыміналісты раяць не паленавацца і крыху намачыць банкноту. Калі фарба паплыве, то будзьце упэўнены — вас спрабуюць падмануць.

камп'ютары IBM PC/AT-286, 386
партатыўныя камп'ютары NOTEBOOK 386SX-20
тэлефаксы SAMSUNG FX-2310
(100 нумароў памяці, таймер)
ксераксы-факсы HITACHI
ксераксы CANON FC-2
маніторы
пішучыя відэаплэйеры GOLD STAR
відэамагнітафоны NEC (2 галоўкі)
тэлевізары SAMSUNG (72 см)
відэадвойкі TOSHIBA
(ТВ-54 см, 7 сістэм, ВМ-2 галоўкі)
бытавыя магнітолы (JAPAN)
мікрахвалявыя печы SAMSUNG
Dainova
tel. (0172) 217-408, 217-903,
588-704 (аўтаінф.)

П. КРЭЧКА, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта:

«Трэба не забараняць ці абмяжоўваць, а рэгуляваць»

Нядаўна ў нашай газеце былі надрукаваны Часовыя правілы ўвозу грамадзянамі на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і вывазу за межы гэтай тэрыторыі прадметаў, валюты, каштоўнасцей. Асобныя пункты гэтых Правілаў выклікалі пытанні ў чытачоў. За адпаведнымі растлумачэннямі наш карэспандэнт звярнуўся да першага намесніка старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта рэспублікі Пятра Васільевіча КРЭЧКІ.

Найперш ён адзначыў, што гэтыя Правілы прыняты для таго, каб прывесці парадак увозу-вывазу ў адпаведнасць з цяперашнімі эканамічнымі ўмовамі. Разам з тым варта ўлічыць: да апошняга часу ўсё рэгулявалася былымі агульнасаюзнымі актамі. Пры выпрацоўцы правілаў у камітэце імкнуліся да таго, каб яны адпавядалі міжнародным нормам. Прычым упор рабіўся на тое, каб не забараняць ці абмяжоўваць увоз-вываз, а рэгуляваць іх, зыходзячы з інтарэсаў рэспублікі, а разам з тым і становішча на спажывецкім рынку. Адпаведна, у Правілах прадугледжаны найбольшыя магчымасці для ўвозу. Абмежаванняў у даным выпадку практычна няма, за выключэннем невялікага кола прадметаў, якія пералічаны ў спецыяльным дадатку.

Зусім новае для нас: на тэрыторыю рэспублікі забаронены ўвоз рублёў і выражаных у рублях каштоўных папер з дзяржаў, у якіх рубель не выкарыстоўваецца ў якасці законнага плацежнага сродку. Напрыклад, з Эстоніі.

Вываз звужаны ў параўнанні з увозам. Акрамя прадметаў, прызначаных для асабістага карыстання, можна дадаткова вывезці і прадметы, прызначаныя для адчужэння за межамі рэспублікі, але толькі на суму да 5.000 рублёў. Забаронены да вывазу некаторыя сацыяльна значныя тавары — швейныя бытавыя машыны, халадзільнікі і г. д.

Наконт вывазу непасрэдна рублёў. У адпаведным пункце Правілаў сказана, што вываз рублёў і выражаных у іх каштоўных папер за межы мытнай тэрыторыі рэспублікі забаронены. І далей: пры часовым выездзе за межы мытнай тэрыторыі рэспублікі дазваляецца ўзяць з сабой да 2.000 рублёў без права іх расходвання і абмену за межамі рублёвай зоны (яны «выдзяляюцца» на білет ад граніцы дадому пры вяртанні назад). Гэта было зразумета асобнымі чытачамі так: пры выездзе за межы Беларусі, нават у краіны рублёвай зоны, нельга браць з сабой больш за 2.000 рублёў. П. Крэчка ўдакладніў: у межах рублёвай зоны можна браць, колькі патрэбна.

У заключэнне ён падкрэсліў, што Правілы менавіта часовыя. Асновай мытнага заканадаўства з'явяцца больш грунтоўныя Мытны кодэкс і Закон аб мытным тарыфе, якія ўжо прыняты на сесіі ў першым чытанні. Ім таксама звернута ўвага на тое, што перамяшчэнне многіх тавараў цераз граніцу (напрыклад, аўтамашын) рэгулюецца іншымі заканадаўчымі актамі, пра што сказана ў самым пачатку Правілаў. Гэтыя акты, яшчэ саюзныя, застаюцца ў сіле да канчатковай выпрацоўкі і зацвярджэння мытнага заканадаўства Беларусі.

А цяпер наконт таго, у чым мы, так сказаць, не зусім сышліся з Пятром Васільевічам. У Часовых правілах ёсць такое паняцце — «прадметы для асабістага карыстання», для якіх устаноўлены пэўныя перавагі пры вывазе з рэспублікі або ўвозе. Я спрабаваў удакладніць, якія прадметы і ў якой колькасці падпадаюць пад гэтае паняцце і, напрыклад, 10 пар увозімых джынсаў можна аднесці да такіх прадметаў ці не? На гэта пытанне было заўважана, што ў Правілах ёсць адпаведны рэгулюючы пункт, у якім гаворыцца: «Характар і колькасць такіх прадметаў павінны адпавядаць заяўленым мэтам». А яшчэ было сказана, што мытны начальнік пры неабходнасці можа затрымаць тыя ж джынсы і высветліць, з'яўляюцца яны прадметамі для асабістага карыстання ці не. І яшчэ было падкрэслена, што мы павінны імкнуцца да цывілізаванасці, і трэба рабіць стаўку менавіта на цывілізаванасць і тых нашых суграмадзян, якія ездзяць цераз граніцу.

Наконт цывілізаванасці цяжка не пагадзіцца. І ўсё ж неканкрэтнасць вышэйпрыведзеных фармулёвак выклікае пытанні. І гутарка тут не наконт таго, каб нейкім чынам абмежаваць нашых суграмадзян, нават тых жа «карабейнікаў» (у ваяжах якіх, між іншым, не бачу нічога страшнага, яны ў рэшце рэшт кампенсуюць неразваротлівасць нашай вытворчасці, ды і гандлю), а наконт таго, каб не дапусціць свавольства мытнага начальніка, каб колькасць прадметаў для асабістага карыстання, правозімых цераз мяжу, не залежала, скажам так, ад яго настрою. Зрэшты, трэба ўлічваць цяперашнюю сітуацыю і той факт, што нашы суграмадзяне, у адрозненне ад заходніх, ездзяць не на экскурсіі. У асноўным.

Яшчэ пытанне: як вызначыць, што вывозімыя прадметы ўжо «для адчужэння за межамі рэспублікі» «цягнуць» менавіта на вызначаную для іх суму ў 5.000 рублёў? У якіх цэнах «цягнуць»?

І яшчэ на адным пункце Правілаў варта спыніцца. Ён, у прыватнасці, абмяжоўвае ў вывазе тых, хто выязджае за мяжу на пастаяннае месца жыхарства. Напрыклад, нельга ўзяць з сабой свае (менавіта свае) тэлевізар, халадзільнік... Можна меркаваць і так: едуць —ну і няхай сабе коцяцца... Але ці будзе гэта цывілізавана ўжо з боку ўсіх нас? Праўда, як можна было зразумець П. Крэчку, гэты пункт, магчыма, крыху відазменіцца.

Іван БАРАНОЎСКІ.

РЭПЛІКА

Адчынілі на базе магазін...

Апошнім часам шырокае распаўсюджанне на многіх базах атрымала адно новаўвядзенне — тут пачалі адчыняць магазіны. Пры гэтым, як правіла, робіцца спасылка на неабходнасць узмацніць фінансавае становішча базы за кошт рэалізацыі прадукцыі, закупленай з дэцэнтралізаваных крыніц. Не стала выключэннем і Ваўкавыская міжрайбаза, дзе ў сакавіку, нават не дачакаўшыся рашэння гарвыканкома, адчынілі магазін па продажу швейных і трыкатажных вырабаў, абутку і іншых рэчаў. І што ж?

Як пераканаліся супрацоўнікі абласной дзяржгандальінспекцыі, усё гэта рабілася ў першую чаргу з мэтай атаварвання работнікаў базы і абслугоўвання вузкага кола блізкіх да іх асоб. Усё вельмі зручна: тавары рэалізуюцца непасрэдна са складоў, а ў магазін перадаюцца беставарныя накладныя і грошы.

Напрыклад, 14 кастрычніка загадчык склада міжрайбазы Я. Адамовіч выпісаў у магазін 2 наборы карпусной мэблі «Русь» па цане 32.440 рублёў. Аднак да 20 кастрычніка іх у магазін не завозілі. Адзін набор па ўказанню дырэктара базы Г. Кільчыцкага прадалі са склада яго знаёмаму, а грошы перадалі ў магазін. Другі набор знаходзіўся на складзе ў чаканні іншага пакупніка. Акрамя таго, па ўказанню дырэктара з гэтага ж склада касір базы Т. Боцвін атрымала 2 крэслы-ложкі. Пры гэтым яны нават не выпісваліся ў магазін. прынялі там ад касіра грошы — і парадак.

15 верасня загадчыца складам Я. Чарнянкова выпісвае ў магазін 2 тэлевізары карэйскай вытворчасці па цане 65 тысяч рублёў. Разам з накладной яна перадае прадаўцу В. Васілінчык грошы за адзін тэлевізар. а другі пакідае на складзе. Пры гэтым на працягу 35 дзён пасля выпіскі гэтай накладной Чарнянкова не ўключала яе ў таварную справаздачу, каб утаіць факт продажу тэлевізара са склада.

Прадавец В. Васілінчык, дарэчы, не толькі саўдзельнічала ў продажы тавараў павышанага попыту са складоў, але і прыхоўвала іх у магазіне ад свабоднай рэалізацыі. Тут і 260 пар мужчынскіх шкарпэтак на суму 6.240 рублёў, і паліто са штучнага футра, і 2 жаночыя джэмперы, на якія, дарэчы, не было прыходных дакументаў.

Дык што, гэта і ёсць узмацненне фінансавага становішча базы?!

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЛІЦЭНЗІЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Смаргонь, Маладзечна, Орша пайшлі адпаведныя тэлеграмы па пераадрасоўцы тых вагонаў з мазутай. Але калі оперупаўнаважаны аддзела абароны эканомікі ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС РБ Уладзімір Маткоў пачаў раскручваць гэту справу, ён устанавіў нямала праколаў, у тым ліку і такія, як адсутнасць адпаведнага дагавора паміж фірмай і ўпраўленнем Беларускай чыгункі. Невядома, як і куды павінны былі пералічваць грошы за рэалізаваную прадукцыю, калі не ўказаны нават разліковыя рахункі...

І ўсё ж, як атрымалася, што мазута, асноўная частка якой была прызначана для рэспублікі, магла сплысці ў суседнюю Літву? Усё проста. На вываз гэтай прадукцыі меўся адпаведны дазвол ад Дзяржкамнафтапрадукта. Пад некаторымі ліцэнзіямі стаяў подпіс былога старшыні камітэта В. Сурмача, пад іншымі — яго намесніка В. Заранка. І каб не пільнасць супрацоўнікаў упраўлення ўнутраных спраў на транспарце, уся гэта дэфіцытная прадукцыя на дзесяткі мільёнаў рублёў трапіла б зусім у іншае месца.

Ліцэнзія — у пераводзе з латыні азначае свабоду, дазвол. Прынамсі такое вызначэнне дае энцыклапедычны слоўнік. Ён жа далей тлумачыць: «Экспартная або імпартная ліцэнзія выдаецца кампетэнтным органам на ажыццяўленне знешнегандлёвых аперацый». Усё проста. Вось толькі слоўнік не ўдакладняе, якую адказнасць нясуць тыя, хто выдае гэтыя самыя ліцэнзіі? Маркуючы старшаму інспектару кантрольна-прапускнога пункта ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце капітану міліцыі Анатолю Слесарэнку і гэта спроба правалілася. Як высветлілася, беларуская камерцыйная асацыяцыя «Забудоўшчык» па разавай ліцэнзіі Дзяржкамнафтапрадукта 11 верасня адправіла ў адрас фірмы «Цэнтр-Цэлтніекс», што ў Латвіі, 500 тон паліва. А цяпер зноў па той жа ліцэнзіі спрабавала адправіць яшчэ 8 цыстэрнаў з палівам.

Сплывае за межы рэспублікі не толькі паліва. Прынамсі ў Прыбалтыцы дужа ласыя на каляровыя металы. 8 кастрычніка на станцыі Лынтупы, якая, як ні дзіўна, абслугоўваецца Літоўскай чыгункай, супрацоўнікі транспартнай міліцыі тармазнулі вагон з 58 тонамі медзі на суму 8 мільёнаў 700 тысяч рублёў. Дарэчы, па дакументах там значыўся зусім іншы груз. Медзь канфіскавана, а жыхар Літвы Вайчуліс Артурас, які спрабаваў вывезці тую медзь, аштрафаваны на 10 тысяч рублёў.

17 лістапада ў Лідзе быў спынены цэлы чыгуначны састаў з металічнымі зліткамі на 35 мільёнаў рублёў. Ён таксама ішоў на Прыбалтыку.

Але найбольш уразіў супрацоўнікаў транспартнай міліцыі груз, выяўлены на чыгуначнай станцыі Калінкавічы. Як паведаміў оперупаўнаважаны аддзела абароны эканомікі ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС Рэспублікі Беларусь Уладзімір Маткоў, яшчэ ў пачатку кастрычніка на чыгуначнай станцыі Калінкавічы на пад'язных пуцях было выяўлена 3 вагоны з алюмініем і 9 з нікелем. Увесь гэты груз, калі меркаваць па дакументах, належаў вытворча-камерцыйнаму аб'яднанню «Палессе ЛТД», што ў Мазыры. І гэта добра вось-вось павінна было пайсці за мяжу. Што датычыцца алюмінію, то з гэтым разабраліся хутка. Тры вагоны спрабавалі адправіць акцыянернаму таварыству «Сінемаль» у Маскву. Увесь груз, кошт якога перавысіў некалькі дзесяткаў мільёнаў рублёў, канфіскавалі. А вось з нікелем доўгі час не маглі знайсці канцы. А яго ж больш як на 2 мільярды рублёў! Кампетэнтныя органы доўга высвятлялі, хто і як арганізаваў пастаўку гэтага каштоўнага грузу, куды і якім чынам яго збіраліся вывозіць. Толькі штрафныя санкцыі за прастой склалі ўжо некалькі мільёнаў рублёў. Нарэшце 12 лістапада Калінкавіцкі раённы суд разгледзеў гэтую справу. Груз канфіскавалі, а дырэктар ВКА «Палессе ЛТД» Н. Бабына аштрафаваны на 10 тысяч рублёў.

Усяго сёлета супрацоўнікі транспартнай міліцыі спынілі больш за 5800 спроб незаконнага вывазу тавараў за межы рэспублікі. Канфіскавана і рэалізавана грузаў на 456 мільёнаў 376 тысяч рублёў. Гэта не лічачы вышэйпамянёнага нікелю, кошт якога перавышае 2 мільярды рублёў. І гэта ўсяго толькі сіламі 232 штатных супрацоўнікаў, якія абслугоўваюць 32 КПП. А там жа жывыя людзі з адносна невысокай зарплатай, на чым і стараюцца сыграць дзялкі з ліцэнзіямі і без іх. Нярэдка сумы хабару, што прапаноўваюцца работнікам міліцыі, складаюць дзесяткі і сотні тысяч рублёў.

На многія тавары, якія незаконна вывозяцца за мяжу, ёсць ліцэнзіі — «ліпавыя» і сапраўдныя, заверяныя подпісамі высокіх чыноўнікаў. Цікава, ці панясе хто з іх адказнасць за разбазарванне нацыянальнага багацця рэспублікі?

Уладзімір ГОЙТАН.

Дзе гэта вуліца, дзе гэты дом?

ГРОДНА. (Белінфарм). Перайменаванне вуліц, якое пачалося ў горадзе, відаць, будзе прадоўжана. А прычынай да гэтага паслужыла рашэнне гарадскіх улад аб адводзе месца пад адміністрацыйны будынак для створанага пару гадоў назад Саюза палякаў Беларусі на рагу вуліц Дзяржынскага і 17 верасня. Аднак «жалезны Фелікс» і падзеі, якія ўвабрала ў сябе ўпамянёная дата, не ва ўсіх у пашане.

Некаторым вуліцам абласнога цэнтра, якія насілі імёны, напрыклад, Энгельса, Кашавога, Крупскай, Цэткін, частцы плошчы імя Леніна сесія Гродзенскага гарадскога Савета ўжо вярнула гістарычныя назвы. І цяпер яны называюцца як даўней, — Гараднічанская, Вялікая Троіцкая, Стэфана Баторыя, Дамініканская, Антонія Тызенгаўза. Будуць мець ранейшую назву, ці атрымаюць новыя імёны вуліцы, на скрыжаванні якіх фірма «Аркада» з Беластока і беларуска-польскае сумеснае прадпрыемства «Палонія» абяцаюць пабудаваць офіс для грамадскай арганізацыі, пакажа час.

«Звычайным» грамадзянам у гэтую паліклініку ў свой час уваход быў забаронены, бо яна абслугоўвала толькі «эліту». Але тут, як і ўсюды, адбыліся значныя змены, і цяпер у Мінскай стаматалагічнай паліклініцы № 2 можна ўбачыць токара, слесара, будаўніка, нават беспрацоўнага. Нязменным застаецца высокае прафесіянальнае майстэрства медыкаў клінікі, іх добразычлівыя адносіны да сваіх пацыентаў.

НА ЗДЫМКУ: загадчык артапедычнага аддзялення Антон Антонавіч ВІТ і ўрач-інтэрн Людміла Сігізмундаўна БАЯРЫНА.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

ПАД ДВУМА КРЫЖАМІ

ПОГЛЯД З ПРАВІНЦЫІ НА НЕПРАВІНЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

СПЫТАЙЦЕ МЯНЕ пра самае яркае ўражанне апошняга часу. Адкажу. Неяк улетку абтрос рукі ад самай надакучлівай і няўдзячнай работы — паліўкі град — і з засмяглай сваёй Пастаўшчыны патрапіў у такі ж засмяглы ды яшчэ наскрозь прапахлы плаўленым асфальтам Мінск. І тут, у гарачыні і задусе цэнтральных вуліц, сустрэў шэсце каталікоў. Відаць, было свята Божага цела. А можа, іншае—былы атэізм зрабіў нас «свабоднымі» ад гэтага ведання. Вялікае шэсце. Харугвы, святары, шмат моладзі. І над усім гэтым, узмоцнены дынамікамі, лунаў беларускі рэлігійны гімн. Уразіў тады не столькі сам факт звяртання да Бога па-беларуску. І чута, і бачана такое ўжо не раз. А найперш натуральнасць гэтага гучання, тое, што вернікі ў шэсці спявалі яго, як дыхалі. Жыву ў самай што ні ёсць беларускай глыбінцы. Роднае слова ў нас яшчэ гучыць і ў вёсцы ды і ў самім мястэчку не змушана па-інтэлігенцку, а вольна і непрыкметна для яго гаспадароў. Але тут шчыра пазайздросціў.

Наўмысна пачынаю досыць узнёсла, таму што сама размова падстаў для такой узнёсласці даць не можа. І ўвогуле, ці варта весці такую размову? Ёсць жа, як кажуць, меркаванне, што гэта журналісты, і асабліва беларускамоўных выданняў, празмерна акцэнтуюць тэму, нават крыўдзяць, нават зневажаюць. Што празмерная іх увага да рускасці праваслаўнай царквы і польскасці каталіцкага касцёла ўвогуле ідзе сёння не на карысць кансалідацыі нашага грамадства. Магчыма, у Мінску, дзе амаль на два мільёны насельнікаў нейкая жменька храмаў, гэта і бачыцца так. Магчыма, на ўсходзе рэспублікі, дзе для таго, каб адкрыць храм, яго трэба часцей за ўсё пабудаваць, такое меркаванне таксама мае падставу. Але на нашым захадзе сітуацыя некалькі іншая. Для прыкладу прывяду Пастаўскі раён, які нічым ад іншых не адрозніваецца. На 50 тысяч насельніцтва тут сёння дзейнічае 7 каталіцкіх касцёлаў, 6 праваслаўных цэркваў, 2 храмы старообрадцаў. Я ўжо неяк параўноўваў гэты «ахоп» з тымі ж дамамі культуры. І калі па колькасці культавыя ўстановы пакуль што прайграюць, то перавага іх ідэй сёння бясспрэчная. І я не сказаў бы, што гэта мода. У 60—70-я, калі вялася самая зацятая барацьба з гэтым самым культам, людзі ўсё роўна хіліліся да касцёла і царквы. Старэйшыя — з той жа зацятасцю, з якой супраць іх вяваў афіцыйна атэізм, а іншага ў нас і не было, маладзейшыя — хаваючыся ад пільнага партыйнага вока. Ну а цяпер ідэалогія царквы і касцёла, самая непасрэдная, знешняя яе частка, літаральна запоўніла тыя нішы і выпаліны, якія пакінулі пасля сябе гады афіцыйнага атэізму. Як бы саромеючыся, часам упікаючы самі сябе, але хінуцца да яе ўсё новыя пакаленні і групы людзей, актыўна і прымусова далучаецца старэйшымі непаслухмяная моладзь.

І мы радуемся, што чалавек шукае і знаходзіць для душы нейкае апірышча, больш надзейнае за догмы, якія дрэнна трымалі душу ў мінулыя дзесяцігоддзі. Ды толькі радасць гэтая для беларуса з гарчынкай.

З юнацтва, школьных гадоў помніцца такі эпізод. У нашу хату сабраліся суседзі. Зайшла размова аб вулічнай навіне. У маладой сям'і з'явілася дзіця. І стала прычынай сваркі паміж мужам і жонкай. Ён хоча хрысціць яго ў царкве, яна і яе радня настойваюць толькі на касцёле.

— Ого, палякі! Яны зацятыя, абавязкова свайго дамогуцца, — гаворыць маці.

— Чаму яны палякі? — пытаюся.

— Як чаму? Каталікі ж, у касцёл ходзяць.

— Ну а мы тады хто?

— Рускія, праваслаўныя.

— Пачакай, нам жа ў школе гавораць, што мы беларусы, у цябе ў пашпарце запісана, што таксама беларуска.

— Можа і беларусы, але ж праваслаўныя...

Гэты дыялог з жыцця, магчыма, нешта і спрошчвае, але досыць яскрава характарызуе сітуацыю. А складанасць яе яшчэ і ў тым, што руская ці польская мова ў храме—гэта адно. Але пры кожным бадай што касцёле, пры кожнай царкве сёння паспяхова дзейнічаюць курсы па вывучэнню закона Божага ці катэхізацыі. Назвы розныя, а сутнасць у тым, што навучаюцца там у асноўным дзеці, якія ў школе яшчэ як след беларускай мовай не «ахоплены», а тут ім іншая мова ў душу западае.

Цікавы дакумент адшукаў мясцовы краязнаўца І. А. Быхавец. Справаздачу Лынтупскай школы за 1910 год. Шмат разнастайных звестак у гэтым дакуменце. Між іншым, і пра нацыянальны састаў вучняў. З шасці дзесяткаў некалькі рускіх, некалькі палякаў, астатнія —беларусы. Сёння ў гарадскім пасёлку Лынтупы жывуць насельнікі з такімі прозвішчамі— нашчадкі тых вучняў. Але пераважная большасць іх ужо лічыцца палякамі, і ў пашпартах маюць такую адзнаку. І роля мясцовага касцёла, які ніколі не спыняў сваёй дзейнасці, у гэтай метамарфозе неаспрэчная.

Прыклады можна было б прыводзіць і далей. Але даказваць сёння нашаму паляку, хто ён на самай справе—марны занятак. Неяк была ў мяне вельмі напружаная, але разам з тым памяркоўная гутарка з актывістам Пастаўскага аддзялення Саюза палякаў. Ні я яго, ні ён мяне ні ў чым не пераканалі. Але пасля таго як гэты сталы ўжо чалавек пайшоў, я хуценька ўзяў аловак і запісаў шмат сакавітых беларускіх слоўцаў, пачутых ад яго. Скептычна адношуся і да беларусізацыі царквы і касцёла. Першая, прынамсі ў нашай мясцовасці, увогуле не збіраецца ісці ні на якія кампрамісы. Ну а касцёле ўжо і на Пастаўшчыне зрэдку можна пачуць імшу па-беларуску. Калі толькі гэту мову хто адважыцца назваць сапраўды беларускай. Ксяндзы ж усе палякі, якія і рускай мовай авалодалі не зусім добра. Зразумела, якое стаўленне да такой мовы ў вернікаў. Горкая ўсмешка — бадай што самая лагодная ацэнка такіх новаўвядзенняў.

Ўвогуле, у апошні час, надрукаваўшы ў мясцовай газеце некалькі артыкулаў па гэтаму пытанню, змог на ўласным вопыце пераканацца, што любое слова ў адрас таго ж касцёла ўспрымаецца вернікамі як сказанае найперш супраць ксяндза, супраць іх пастара і дарадцы. А за яго яны гатовы стаць гарой. Так нечакана і вельмі балюча для сябе страціў узаемаразуменне з тымі людзьмі, якіх лічу соллю роднай зямлі.

Дзесяткі і нават сотні людзей—са шматлікіх дэлегацый у абарону — прайшлі перад вачамі. Назаўжды запомніўся твар адной жанчыны. Такога ўзросту, што, напэўна, учукі ўжо школу заканчваюць. Шмат пабачыла яна на сваім вяку. А колькі работы перарабілі гэтыя не жаноцкія ўжо, пацямнелыя рукі! На сваіх плячах выцягвала яна калгасы, працуючы ў свой час за «палачкі». Ды і сёння менавіта яна, такія як яна, цягнуць няўдзячны воз сельскай гаспадаркі, працуючы і ў калгасе, і на ўласных сотках, гадуючы скаціну, здаючы малако, кормячы нас з вамі. Усе гэтыя гады шукала яна паратунку ў касцёле. Калі закрылі яго ў роднай вёсцы, ездзіла бадай што кожную нядзелю ў далейшы, старалася, каб і дзеці, і асабліва ўнукі ратаваліся ў ім ад згрызот і звад сучаснага свету. І вось, калі ў чарговы раз прыйшла свабода, стала магчымым аднавіць ужо паўразбураны храм, яна першая прыйшла на яго аднаўленне, прынесла сваю чэсную капейку. Побач з ёю крывавіў рукі, выносячы друз і каменне, малады ксёндз, які прыехаў з Польшчы з адным хатулёчкам. Яна яго і карміла сваімі прысмакамі. З ім нібы параднілася ў гэтай барацьбе за храм. А якая ў ім гучыць мова—не так і важна ў рэшце рэшт. З маленства звычная польская — то хай яна і будзе. І такіх людзей вакол храма тысячы. Я не хачу выступаць у ролі нейкага празорцы ці прадказальніка. Але нельга не бачыць, што калі і далей жыццё ў касцёле і вакол яго будзе развівацца гэтак жа, мы можам ужо ў бліжэйшым будучым атрымаць рэальнасць рэферэндумаў і іншых масавых узрушэнняў, якія будуць служыць далёка не на карысць нацыянальна-дзяржаўнай цэласнасці.

А пакуль што ў Паставах наспявае ці ўжо нават наспеў канфлікт мясцовага значэння. Раённыя ўлады адназначна негатыўна паставіліся да дзейнасці ксяндза Кшыштафа Пажарскага, які служыць у Дуніловіцкай і Лучайскай парафіях. Гэтак жа адназначна на яго абарону выступаюць вернікі. Пасля абходу ўсіх раённых кабінетаў, пасылкі дэлегацый яны, наколькі мне вядома, вырашылі не складаць сваіх сцягоў. На якіх, уласна, і напісана не так багата: не рушце нашага ксяндза, больш нам нічога не трэба, нават з беларусізацыяй будзем мірыцца. Але і ўлады адступаць не збіраюцца. І вось ужо вернікі звяртаюцца да старшыні раённага Савета, народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь В. В. Чэпіка з адкрытым лістом, у якім напамінаюць яму аб сваім праве выбаршчыкаў — праве збору подпісаў для правядзення мясцовага рэферэндуму аб адозве дэпутата, роспуску раённага Савета.

Мне б хацелася атрымаць адказ на адно вельмі надзённае пытанне: калі ўсё-такі будуць да канца акрэслены і законам адрэгуляваны адносіны дзяржавы і царквы? Усе ксяндзы, якія працуюць на Пастаўшчыне, — палякі, настаяцелі праваслаўных храмаў — альбо рускія, альбо украінцы. Міжволі ўспамінаецца радок з аднаго ліста, які атрымаў ад вернікаў: «Нашы мясцовыя няздатныя навучыцца, вось і прыязджаюць ксяндзы з Польшчы, трэба ім дзякаваць за гэта». Можа і сапраўды няздатныя? Ці гэта водгукі нечай мэтанакіраванай палітыкі?

Але нацыянальнасць і грамадзянскасць светароў — толькі адзін штрышок. Стаўленне дзяржавы да царквы, калі прыме калі-небудзь яно цывілізаваныя і акрэсленыя формы, павінна зняць многія пытанні, развязаць многія моцна завязаныя вузлы і вузельчыкі.

...Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл у Паставах маладзейшыя за сваіх братоў і сясцёр з навакольных вёсак і мястэчак. Сто ці крыху больш гадоў стаяць яны насупраць адзін аднаго над хвалямі Мядзелкі. А калі надвор'е ціхае, адлюстраванні залачоных крыжоў, розных знешне, а па сутнасці аднолькавых, зліваюцца на вадзе. Не раз назіраў гэту ідылічную карціну. І ў рэшце рэшт і з'явіліся ж яны з аднаго кораня. Потым пачаліся падзелы, потым чысціню веры, як ваду ў рэчцы, пачала каламуціць палітыка. А так хочацца, каб ад людзей да храма і ад храма да людзей ішлі толькі промні чыстай веры.

Алесь КАСЦЕНЬ.

ВАША ПІСЬМО АТРЫМАЛІ

Паважаныя нашы падпісчыкі і чытачы! У «Звязду» штодзённа прыходзіць цэлы стос вашых пісьмаў, сярод якіх нямала скаргаў, заяў, просьбаў, запытаў і трывожных сігналаў. Адначасова ў рэдакцыю на такія вашы допісы з міністэрстваў, ведамстваў, арганізацый паступаюць адказы з вынікамі праведзеных праверак і паведамленнямі аб прынятых мерах.

Сёння мы змяшчаем чарговую падборку гэтай перапіскі.

БЕЖАНЦАМ ТАКСАМА ПАТРЭБЕН ПРЫТУЛАК

Ліст жыхароў в. Хадатавічы Нясвіжскага раёна, пад якім стаяла 10 подпісаў, так і называўся — «Вярніце нам клуб». Вяскоўцы абураліся тым, што гэту ўстанову культуры ператварылі ў жылое памяшканне, і ім няма дзе адпачыць, правесці нейкую ўрачыстасць...

Начальнік упраўлення культуры Мінскага аблвыканкома В. ГЕДРОЙЦ даслаў у рэдакцыю даведку, якая сведчыць, што ў в. Хадатавічы ў прыстасаваным памяшканні (былая пачатковая школа) размешчаны калгасны клуб. Ён знаходзіцца на балансе сельскага Савета, але арэндаваў яго мясцовы калгас. Там працавала загадчыцай Ф. Драгавец, якая звольнена з гэтай пасады па прычыне дэфіцыту сродкаў у калгасе.

Сапраўды, зараз у двух пакоях тут жыве сям'я бежанцаў з Малдавіі, якая паселена часова. Аднак у памяшканні клуба ёсць зала, дзе жыхары могуць праводзіць свой вольны час, глядзець кінафільмы.

У сувязі з адсутнасцю пастаяннага клубнага работніка аддзел культуры райвыканкома даручыў раённаму і Аношкаўскаму сельскаму дамам культуры праводзіць у в. Хадатавічы мерапрыемствы па культурнаму абслугоўванню вяскоўцаў. У сваю чаргу праўленне калгаса «Новае жыццё» шукае пастаяннае жыллё для перасяленцаў і пры першай жа магчымасці вызваліць памяшканне сельскага клуба.

ЧАКАЙ І СПАДЗЯВАЙСЯ, НАСТАЎНІК!

А вось настаўніца з в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна А. Барадаўка не бежанка, але ў яе таксама складаная жыллёвая праблема. І куды толькі працаўніца на ніве асветы не звярталася, ніхто ёй не дапамог вырашыць гэтае важнае жыццёвае пытанне.

На пісьмо ў «Звязду» намеснік старшыні Петрыкаўскага райвыканкома Н. ЮХНЕВІЧ адказаў так: «У 1993 годзе ў в. Лучыцы будзе весціся будаўніцтва двух аднакватэрных дамоў для настаўнікаў за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца ўпраўленнем адукацыі Гомельскага аблвыканкома».

Будзем спадзявацца, што так яно і будзе.

СЕЛЬСКІЯ ТУРБОТЫ ГАРАДЖАНІНА

Нас крыху нават здзівіла: наш чытач І. Хендогій жыве ў Мінску, у мікрараёне «Уручча», але яго хвалююць сельскія праблемы. У прыватнасці, ён напісаў аб тым, што ў калгасе «Камунар» Бярэзінскага раёна ліквідавалі жывёлагадоўчую ферму.

У адказе старшыня Бярэзінскага раённага Савета народных дэпутатаў К. МЕЛЬНІКАЎ растлумачыў, што ў 1988 годзе землі, якія належалі калгасу «Камунар» і знаходзяцца навокал вёсак Кукарава і Гацец, былі перададзены для расшырэння падсобнай гаспадаркі «БелаўтаМАЗа». У сувязі з гэтым кароўнік на 200 галоў у в. Кукарава з-за відавочнага зносу быў ліквідаваны, бо скончыўся тэрмін яго амартызацыі. Частка дабротных будаўнічых матэрыялаў (шыфер, цэгла, блокі і інш.) былі дэманціраваны для рэканструкцыі і рамонту жывёлагадоўчых ферм, а астатнія рашэннем праўлення калгаса адпушчаны вяскоўцам за наяўны разлік.

КРЫЎДНАЯ ЗАБЫЎЛІВАСЦЬ

У многіх пісьмах узнімаюцца пытанні агульнага характару. А вось у заяве інвалід Вялікай Айчыннай вайны з в. Радунь Лепельскага раёна В. Якушаў адстойвае сваё законнае права на бясплатны праезд у пасажырскім аўтамабільным транспарце, што мае ў той жа час і грамадскае гучанне, датычыць многіх пажылых людзей.

З гэтым пагадзіўся і намеснік старшыні, загадчык аддзела па эканоміцы і рыначных адносінах Лепельскага райвыканкома В. ЛАУРЫНОВІЧ. У яго рэагаванні сказана, што, згодна з шэрагам пастаноў урада Рэспублікі Беларусь, права на бясплатны праезд на пасажырскім аўтамабільным транспарце агульнага карыстання (прыгарадных, унутрыраённых, міжгародніх, унутрыабласных, міжрэспубліканскіх маршрутаў) у сельскай мясцовасці прадастаўляецца ў межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства інвалідаў (як пастаянных, так і часовых).

Адпаведна і інвалід вайны В. Якушаў мае права на бясплатны праезд, і, узяўшы з яго плату за білет на аўтобус Віцебск—Докшыцы, парушылі зазанадаўства. Адміністрацыя аўтапарка № 4 г. Лепеля і адпаведныя яго службы будуць забяспечаны неабходнымі дакументамі, у якіх растлумачваецца льготнае права інвалідаў і ўдзельнікаў вайны на праезд у пасажырскім аўтамабільным транспарце.

Трэба, каб гэта як свае пяць пальцаў ведалі не толькі работнікі лепельскага аўтапарка, але і кожнага аўтавакзала і аўтастанцыі. Вось тады такіх скаргаў і непаразуменняў не будзе.

ВЯРНУЛІ ГАДЫ ПРАЦОЎНАГА СТАЖУ

«У свой час я працаваў у Мангольскай Народнай Рэспубліцы, — скардзіўся І. Стратановіч з г. Бабруйска, — але мне не толькі не залічылі гэтыя гады ў працоўны стаж, а нават не захацелі выдаць адпаведную даведку. Дапамажыце дабіцца справядлівасці».

Намесніку начальніка ўпраўлення па эканоміцы і рыначных адносінах Бабруйскага гарвыканкома Л. САВІНАЙ давялося двойчы інфармаваць рэдакцыю аб тым, што робіцца па вырашэнню пытання, змешчанага ў гэтай заяве. І вось нарэшце прыйшло паведамленне: «Гр. Стратановічу І. А. адміністрацыяй народнага прадпрыемства «Бабруйскдрэў» выдадзена даведка, якая пацвярджае яго знаходжанне ў Мангольскай Народнай Рэспубліцы ў 1963—1965 гг. Падставай з'явіліся дакументы: загад кіраўніка прадпрыемства аб яго камандзіраванні туды і ведамасць на атрыманне заработнай платы».

Хоць і з вялікім спазненнем, але пытанне вырашана станоўча.

ПАДРЫХТАВАЎ ДА ДРУКУ АДДЗЕЛ ПІСЬМАЎ «ЗВЯЗДЫ» (тэлефон 32-04-52).

РОЗГАЛАС

«АБ'ЕКТ-802» ПЕРАНОСІЦЦА?

БРЭСТ. 16 тысяч кубічных метраў радыеактыўнага грунту з «Аб'екта-802» (былой базы па перагрузцы ўрану, што недалёка ад крэпасці) вясной будучага года павінны вывезці і захаваць на адным з вайсковых палігонаў Брэсцкай вобласці.

Аб гэтым паведаміў мясцовай газеце «Брестский курьер» начальнік гаррайінспекцыі па экалогіі Брэста А. С. Жамчужны. Паводле цяперашніх цэн, гэта будзе каштаваць 100 мільёнаў рублёў. Палова з іх выдзелена Мінатамэнерга Расіі.

Радыяцыйны фон на гэтым па-ранейшаму ахоўваемым аб'екце небяспечны для здароўя грамадзян.

ПРАФСАЮЗЫ ВЫКАЗАЛІ ПРАТЭСТ

У чарговы раз значна павышаны цэны на прадукты харчавання першай неабходнасці і паслугі. Гэта зроблена без папярэдняга паведамлення прафсаюзаў, што з'яўляецца парушэннем існуючага заканадаўства і пагаднення, якое заключана на гэты год паміж урадам, аб'яднаннямі работадаўцаў і прафсаюзамі.

Федэрацыя прафсаюзаў выказала пратэст супраць такіх дзеянняў дзяржаўных і гаспадарчых органаў і запатрабавала ў бліжэйшыя два дні правесці сустрэчу з кіраўніцтвам Савета Міністраў па праблемах цэн і сацыяльнай абароны насельніцтва.

Прэс-цэнтр Савета ФПБ.

30 працэнтаў ад «пірага»—насельніцтву

МІНСК. Узаемавыгадныя эканамічныя сувязі ўстаноўлены паміж Мінскім трактарным заводам і кітайскімі фірмамі.

— Ужо падпісаны кантракт на пастаўку завадчанам адной тысячы тон цукру з Кітая, — расказаў выконваючы абавязкі начальніка бюро імпарту заводскай знешнегандлёвай фірмы Сяргей Бахрушын. — Акрамя таго, гандлёвымі пагадненнямі прадугледжана паступленне на МТЗ вялікай партыі адзення і абутку — пуховых куртак, спартыўных касцюмаў, красовак і плашчоў. Усе гэтыя здзелкі, у тым ліку і пастаўка ў Кітай трактароў і запчастак, ажыццяўляюцца на аснове бартэру. Яны дазволены Дзяржаўным камітэтам па знешнеэканамічных сувязях Рэспублікі Беларусь. Гэтым жа рашэннем устаноўлена, што на 30 працэнтаў кошту пастаўляемых у Кітай трактароў і запчастак (у адпаведнасці з нарматывам валютных адлічэнняў у бюджэт) МТЗ павінен закупляць тавары народнага спажывання і для насельніцтва рэспублікі.

Алег ПРАЦЬКО.

Самастойнасць—справа непрадказальная

СЛОНІМ. У гэтым горадзе больш няма гаргандлю. Ён ліквідаваны, а замест яго створана дзяржаўная аптова-рознічная фірма «Світанак», у саставу якой увайшлі складская гаспадарка, вінна-гарэлачныя магазіны і некаторыя прадуктовыя крамы. Большасць магазінаў сталі самастойнымі, і жыхары Слоніма цяпер гадаюць, як гэта адаб'ецца на іх кашальках.

ЦІХА! ЛІТВА ДУМАЦЬ БУДЗЕ

У канцы мінулага тыдня беларуская дэлегацыя на чале з паслом па асобых даручэннях С. Агурцовым прыбыла ў Друскінінкай для вядзення перагавораў наконт лёсу санаторыя «Белоруссия». Аднак прадстаўнікі літоўскага боку на сустрэчу не спяшаліся. Замест раней прызначанага часу ў першай палове дня перагаворы адбыліся толькі ўвечары. Вынікам сустрэчы сталі запэўненні літоўцаў, што беларуская дэлегацыя будзе запрошана на пасяджэнне сейма Літвы па пытаннях уласнасці, дзе і будзе вырашацца лёс санаторыя.

Віктар ФЕДАРОВІЧ. (БелаПАН).

ЯСНА АДНО, ШТО НІХТО НЕ ХОЧА ПАМІРАЦЬ

БАРАНАВІЧЫ. Цікавае рашэнне прыняў нядаўна мясцовы гарсавет: ён стварыў камісію па ліквідацыі гарпрамгандлю. Цяпер усе магазіны, за выключэннем некалькіх, маюць статус юрыдычнай асобы і могуць запаўняць таварамі свае паліцы па прамой дамоўленасці з пастаўшчыкамі. Які лёс чакае астатнія гандлёвыя структуры — сказаць немагчыма.

ДОКТАР—ТОРФ

Інстытут праблем прыродных рэсурсаў і экалогіі Акадэміі навук Беларусі звярнуўся ў Магілёўскі аблвыканком з пісьмом, у якім змяшчаецца просьба не выкарыстоўваць у іншых мэтах каштоўныя тарфяныя радовішчы. Справа ў тым, што ў выніку навуковых даследаванняў было ўстаноўлена: торф, які залягае ў некаторых урочышчах Магілёўскай вобласці, прыгодны для лячэбных мэт.

Радовішчы знаходзяцца ў экалагічна чыстых мясцовасцях, не падвергнутых радыяцыйнаму забруджванню. А запасы прыроднага прадукту такія, што яго хопіць для лячэння хворых на працягу 50 гадоў.

Барыс МІХЕЕЎ. (БелаПАН).

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

«Чорная кошка» не павінна прабегчы

Прачытаўшы інтэрв'ю начальніка аддзела па асабліва важных справах пры Генеральным пракурору Рэспублікі Беларусь Валерыя Собалева «Хто дапаможа следчаму?» («Звязда» ад 3.12.92), а да гэтага — артыкул Б. Залескага ў «Вячэрнім Мінску» (1.12.92) «Аб следчых пракуратуры забылі?», хочам падтрымаць прапанову аб паляпшэнні сацыяльнай абароненасці гэтай катэгорыі работнікаў пракуратуры. За нашымі пажаданнямі стаяць і галасы супрацоўнікаў МУС і КДБ, якія разам са следчымі пракуратуры разблытвалі складаныя крымінальныя справы і бачылі іх высокі прафесіяналізм, адданасць абавязку і вялікую працаздольнасць.

Давядзенне матэрыяльнага забеспячэння следчых пракуратуры да ўзроўню МУС і КДБ, што падкрэслівалася ў названых публікацыях, на наш погляд, яшчэ больш паспрыяла б цеснаму кантакту, супрацоўніцтву, а галоўнае — выніковасці ў барацьбе гэтых трох ведамстваў супраць карупцыі, арганізаванай і іншай злачыннасці. Апошнім часам усе мы яшчэ больш пераканаліся ў тым, што толькі агульнымі намаганнямі можна перамагчы гэтую ракавую пухліну грамадства.

Але, падтрымліваючы разважанні наконт вышэйадзначанага на карысць следчых пракуратуры, хацелася б выказаць свае крытычныя заўвагі В. Собалеву за, мякка кажучы, не зусім карэктную ў адносінах да КДБ і МУС аргументацыю пазіцыі аўтара. Мы не будзем зараз распачынаць палеміку наконт таго, чым адрозніваюцца следчыя аднаго ведамства ад другога, ці чаму адны пагоны даражэй за другія. Толькі адзначым, што следчыя КДБ і МУС пастаянна знаходзяцца ў сферы апératыўна-вышуковай дзейнасці, якая добра камечыць іх ваенныя мундзіры.

Вы, Валерый Васільевіч, добра ведаеце, што ў нашай агульнай практыцы існуе пэўны падзел абавязкаў, калі КДБ ці МУС, выканаўшы папярэдне ўсю чарнавую работу, перадае матэрыялы ў пракуратуру для ўзбуджэння крымінальнай справы. Так было практычна па ўсіх названых Вамі ў інтэрв'ю крымінальных справах: і «па Мезіну», і «па ўрану», і «па вайскоўцах», і «па беларуска-аўстрыйскаму прадпрыемству»... І мы не бачылі б тут ніякага прыменшэння ролі сваіх ведамстваў, калі б Вы аб гэтым сказалі хоць адно слова. Паверце, «лаўры пераможцы» нас нікольки не хвалююць. Больш таго, мы заўжды ўдзячныя за канструктыўную крытыку. Але недагаворанасць і падтэкст у Вашым выступленні могуць быць не зусім правільна зразуметы нашымі людзьмі.

Мы таксама хацелі б выказаць словы вялікай удзячнасці Уладзіміру Кандрацьевічу Кандрацьеву, які асабіста праявіў высокую прынцыповасць і грамадзянскую адказнасць, узбудзіўшы крымінальную справу на кіраўнікоў Дзяржкамнафтапрадуктаў. Толькі для поўнага раскрыцця прыведзенага эпізоду трэба было б адзначыць, колькі разоў КДБ і МУС дамагаліся ў Вас асабіста ўзбуджэння гэтай крымінальнай справы, прадстаўляючы ўсё новыя і новыя доказы і атрымліваючы ўсё новыя і новыя адмовы, пакуль гэтую адказнасць не ўзяў на сябе выконваючы абавязкі Генеральнага пракурора.

Падтрымліваючы, падкрэсліваем, справядлівыя патрабаванні сваіх падначаленых, не трэба на вачах усіх грамадзян Беларусі кідаць незаслужаны цень на іншых, асабліва сваіх паплечнікаў па агульнай справе.

Якія эмоцыі ў адносінах да Камітэта дзяржбяспекі выклікаюць у чытача, напрыклад, Вашы радкі аб абяшкоджванні «вялікай банды ў Магілёве», якую «ўзначальваў былы супрацоўнік КДБ Валерый Ткачоў»? Акрамя, магчыма, некалькіх магіляўчан, ніхто не ведае, што В. Ткачоў яшчэ задоўга да таго як стаў злачынцам, 14 гадоў таму назад быў звольнены са службы за «дыскрэдытацыю звання супрацоўніка КДБ»... Прыводзячы «цікавы» на Ваш погляд факт, што ў беларуска-аўстрыйскім прадпрыемстве, супраць работнікаў якога ўзбуджана крымінальная справа, працуе былы следчы КДБ (якому, заўважце, было не проста далёка да пенсіі, а вельмі далёка), Вы не растлумачылі, па-першае, што калісьці гэты супрацоўнік звольніўся з органаў дзяржбяспекі па прычыне сваёй незадаволенасці матэрыяльным забеспячэннем, і, па-другое, прысутнасць дасведчанага ў апératыўна-следчай рабоце чалавека «з сувязямі ў КДБ», тым не менш не перашкодзіла таму ж КДБ і МУС эфектыўна выявіць злачынцаў у названай фірме.

Паважаны Валерый Васільевіч! Мы не ставім мэтай вышукваць недакладнасці ў Вашым артыкуле ці разглядаць зараз паднаготную «ўранавай» альбо якой-небудзь іншай з названых спраў. Галоўнае — наша бескарыслівае супрацоўніцтва ў справе служэння народу, захавання Закона і справядлівасці. Мы не хацелі б, каб хтосьці (наўмысна або не) пускаў паміж намі «чорную кошку», ад чаго прайграюць і нашы ведамствы, і ўсё грамадства.

М. ІЛЬЮК,
начальнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю КДБ.
М. САЗОНАЎ,
намеснік начальніка ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю МУС.

Мікалай Іванавіч ІГНАТОВІЧ



5 снежня 1992 года на 53-м годзе жыцця пасля цяжкай працяглай хваробы памёр Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь дзяржаўны саветнік юстыцыі 3 класа Мікалай Іванавіч Ігнатовіч.

Заўчасна, у росквіце творчых сіл абарвалася жыццё чалавека, які прысвяціў усяго сябе без астатку беззапаветнаму служэнню Радзіме, умацаванню законнасці, абароне праўды і справядлівасці.

М. І. Ігнатовіч нарадзіўся 17 мая 1940 года ў вёсцы Адахаўшчына Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы працаваў аўтаслесарам на Баранавіцкім рамонтным заводзе. Затым — служба ў арміі. Пасля дэмабілізацыі зноў стаў працаваць рабочым у родных Баранавічах.

Пасля заканчэння ў 1968 годзе юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Мікалай Іванавіч быў накіраваны для работы ў адвакатуры. Асабліва праявіліся яго якасці як высакакласнага юрыста на службе ў органах пракуратуры, куды ён прыйшоў у 1970 г. Працуючы следчым Слуцкай міжрайпракуратуры, старшым следчым пракуратуры Мінскай вобласці, следчым па асабліва важных справах пры пракурору рэспублікі, Мікалай Іванавіч у вельмі складаных умовах бліскуча правёў рад крымінальных спраў, выкрыўшы небяспечных злачынцаў і раскрыўшы надзвычай цяжкія злачынствы.

У 1989 годзе М. І. Ігнатовіч выбіраецца народным дэпутатам СССР, становіцца членам Вярхоўнага Савета СССР, актыўна працуе ў Камітэце па галоснасці, правах і зваротах грамадзян. У 1990 г. ён выбіраецца старшынёй Камісіі па пытаннях прывілей і льгот.

15 кастрычніка 1991 года Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь М. І. Ігнатовіч быў выбраны Генеральным пракурорам рэспублікі і адразу ж актыўна ўключыўся ў работу па ўдасканаленню дзейнасці органаў пракуратуры і ўмацаванню правапарадку.

Працавітасць, прынцыповасць, непрымірымасць да любых праяўленняў несправядлівасці і беззаконнасці, уважлівыя і чулыя адносіны да людзей здабылі яму заслужаны аўтарытэт і павагу ў Беларусі.

Светлая памяць пра Мікалая Іванавіча Ігнатовіча, вернага сына беларускага народа, назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

С. С. Шушкевіч, В. Ф. Кебіч, В. М. Кузняцоў, В. І. Шаладонаў, М. У. Мясніковіч, М. І. Грыб, Д. П. Булахаў, У. К. Кандрацьеў, А. К. Глюкаў, І. Ф. Сашчэка, В. Б. Юрэвіч, У. С. Каравай, У. В. Бойка, Л. А. Дашук, У. Д. Ягораў, Э. І. Шыркоўскі, В. П. Гаўрыльчык, Л. Е. Драбышэўскі, В. Г. Іваноў, В. В. Любавіцкі, Л. Ф. Нікалаеў, В. А. Сіраш, Л. П. Цярэшчанка, Н. С. Шахметаў.

Усё золата свету—наша!

Чэмпіянат свету па самба, які прайшоў у Мінскім Палацы спорту, завяршыўся бліскучым выступленнем нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь. Пяць залатых і 2 сярэбраныя ўзнагароды заваявала мужчынская каманда, пяць залатых і адну бронзавую — жаночая. Сапраўдны трыумф, якога не ведала яшчэ гісторыя гэтага маладога, але вельмі папулярнага ўжо віду барацьбы.

НА ЗДЫМКАХ нашага фотакарэспандэнта — «рабочыя» моманты сусветнага чэмпіянату. На адным з іх — цяпер ужо двухразовая чэмпіёнка свету Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ. У нялёгкай яна сітуацыі. Але беларуская спартсменка знойдзе выйсце і з яе і зноў узнімецца на п'едэстал гонару.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

ІМ—БРЫКЕТ, НАМ—ДОЛАРЫ

Як паведамляе жабінкаўская раённая газета «Сельская правда», торфабрыкетчыкі завода «Гатча-Осаўскі» выходзяць на замежны рынак. У жніўні яны заключылі дагавор з брэсцкай фірмай «Марго плюс» на пастаўку праз яе пасрэдніцтва ў Венгрыю 500 тон торфабрыкету. Замежныя партнёры будуць разлічвацца з жабінкаўскімі брыкетчыкамі валютай.

БелаПАН.

ВАЛЮТНАЯ ЛІХАМАНКА: ТОЛЬКІ БАНК НАДЗЕЯ І АПОРА

«Падарунак з'езду», «змова Гайдара з Герашчанкам» — якіх толькі эпітэтаў не атрымаў выбуховы рост рубля на Маскоўскай міжнароднай валютнай біржы (ММВБ). Зразумела, што акрамя чыста эканамічных фактараў (канец года — прадпрыемствы павінны аддаваць крэдыты, пазыкі, выплачваць розныя прэміі і сацыяльныя выплаты), моцна паўплывалі і палітычныя калізіі — невядома, чаго чакаць ад з'езда расійскіх дэпутатаў, ці не пажадае штучна - адміністрацыйна «стабілізаваць» рубель якінебудзь іншы, безгайдараўскі, урад. Усе гэтыя драмы можна было б назваць праблемамі іншай краіны, калі б яны не адбіваліся на нашых справах самым непасрэдным чынам.

Як жа адчуваў сябе беларускі валютны рынак на мінулым ліхаманкавым тыдні? Безумоўна, хлопчыкі-валютчыкі спяць і бачаць чарговае павелічэнне курса долара, бо менавіта ў такі момант іх даходы ўзрастаюць у геаметрычнай прагрэсіі. Напалоханы навінамі абывацель бяжыць здаваць сваю валюту, але ж... банкі ўжо зачынены, а валютчыкі дадуць табе за долар «ажно» 420 рублёў, пераконваючы, што заўтра ён упадзе яшчэ больш. Менавіта так было ў чацвер, калі на біржы курс безнаяўнага долара склаў 398 рублёў. Уяўляю сабе роспач людзей, здаўшых сваю валюту і ўбачыўшых на наступны дзень, што банкі даюць па 450—460. Адсюль галоўны запавет: **здавайце валюту ў банкі,** гэта выгадна ў любым выпадку. Калі банк дае мала — валютчыкі заўсёды будуць побач і дадуць больш; калі ж курс банка дастаткова высокі, — ніякі валютчык не «адшпіліць» вам ні рубля болей.

Так, дарэчы, і было ў гэтыя выхадныя. За долар у Мінску давалі 440—450, і многія наіўныя, пэўна, здавалі з радасцю. У панядзелак жа прачнуліся і выявілі, што «Прыорбанк» дае 470 і (што натуральна) там вялікая чарга здатчыкаў і ніводнага валютчыка побач. Адсюль вынікае яшчэ адзін запавет — у выхадныя заўсёды ажыятаж, лепей дачакайцеся панядзелка.

Сёння, калі вы атрымаеце газету, на ММВБ будуць чарговыя таргі. І, напэўна, чарговае змяненне курса. Але не спяшайцеся бегчы на Камароўку, бо на вас зноў нехта пажывіцца.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

✻ У Эстоніі па прыкладу Літвы і Латвіі з'явілася Дэмакратычная партыя працы, якая аб'яўлена правапераемніцай кампартыі. Яна атрымала ў спадчыну яе маёмасць і членаў (каля трох тысяч чалавек) і стала адной з буйнейшых партый у краіне.

✻ У тым, што ўпаў курс долара ў адносінах да рубля, «вінаваты» Цэнтральны банк Расіі. Ён спыніў бескантрольную выдачу крэдытаў, друкаванне грошай і паступленне рублёў з краін СНД, якія ўвялі ўласную валюту. Але курс долара зноў да канца года павысіцца.

✻ Ізраільская дэлегацыя прыбыла ў Вашынгтон на восьмы раунд перагавораў з палесцінцамі па праблемах Блізкага Усходу. Арганізацыя вызвалення Палестыны афіцыяльна не ўваходзіць у саставу дэлегацыі, але яна накіроўвае яе работу.

✻ Шматлікія банды перашкаджаюць спробам ААН выратаваць жыццё мільёнаў самалійцаў, якія пакутуюць ад голаду. Тым часам ужо гатовыя войскі ААН для абароны аўтакалон з прадуктамі харчавання.

✻ Міністры замежных спраў і сельскай гаспадаркі ЕС сабраліся ў Бруселі. Перагаворы прысвечаны ў асноўным сельскагаспадарчым дамоўленасцям, заключаным паміж ЕС і ЗША. Францыя выступае супраць гэтага пагаднення і настойвае на яго пераглядзе, бо яно скарачае субсідыі фермерам.

✻ Прэм'ер-міністр Славакіі заявіў, што сённяшнія спецслужбы краіны не маюць дачынення да ўстаноўкі праслухоўваючых прыбораў у консульствах замежных краін. Яны былі ўстаноўлены пяць гадоў назад пры камуністах.

«БІ-БІ-СІ»

✻ У Бішкеку на міжнароднай сустрэчы па правах чалавека прадстаўнікі Узбекістана заявілі, што ў іх краіне падаўляецца іншадумства, што кіраўніцтва рэспублікі наўмысна перабольшвае ісламскі фактар, каб Расія і Захад змірыліся з жорсткай уладай ва Узбекістане.

✻ Лідэр дэмакратычнай партыі Таджыкістана Юсуф заявіў, што міру і згоды ў Таджыкістане і Сярэдняй Азіі не будзе, пакуль 201-я дывізія расійскіх войск знаходзіцца ў Душанбе. Аднак ён падкрэсліў, што яго краіна павінна ж застацца з Расіяй, бо ў яе няма іншага выйсця.

Узброеная брытанская паліцыя ўстанавіла на дарогах вакол Лондана кардоны з мэтай спыніць пастаўкі ў горад узрыўчатых тэрарыстычнай арганізацыяй «Ірландская рэспубліканская армія».

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

✻ Целы трох амерыканскіх манашак, якія былі паверску забіты ў Ліберыі, адпраўлены дамоў.

✻ У цэнтральных правінцыях Анголы зноў завязаліся баі паміж урадавымі войскамі і паўстанцамі.

✻ Дзве групы інспектараў ААН знаходзяцца ў Іраку. Яны высвятляюць, якія краіны пастаўлялі Багдаду забароненую тэхналогію.

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

✻ Згодна з прагнозам эканамічнай камісіі ААН, для Захаду Еўропы 1993 год будзе суправаджацца слабым эканамічным ростам, Усход па-ранейшаму будзе перажываць цяжкасці.

✻ У Боснії пасля захопу сербамі прыгарада Сараева забіта больш за сто чалавек. Шмат людзей пахаваны пад абломкамі дамоў у падвалах. У горадзе няма электраэнергіі, вады, тэлефоннай сувязі.

✻ Егіпет і Турцыя заклікалі Савет Бяспекі ААН да ваеннага ўмяшання ў Боснію-Герцагавіне. Інакш будзе склікана сустрэча дзяржаў, якія ўваходзяць у арганізацыю «Ісламская канферэнцыя», для пошуку свайго рашэння.

✻ Старшыня кампартыі Чэхіі Іржы Свобада цяжка паранены. Незнаёмыя бандыты хацелі зарэзаць яго нажом, калі ён выходзіў з дому. Пра матывы замаху пакуль нічога невядома.

✻ Урад Германіі будзе і далей аказваць фінансавую дапамогу нямецкаму насельніцтву ва Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе. На гэтыя мэты з дзяржаўнага бюджэту ў 1993 годзе будзе выдаткавана 250 мільёнаў марак. Асноўная частка грошай пойдзе на падтрымку расійскіх немцаў.

✻ У сярэдзіне студзеня будучага года Германію наведае генеральны сакратар ААН Б. Галі. Ён будзе абмяркоўваць перспектывы ўдзелу ўзброеных сіл бундэсвера ў міратворчых акцыях ААН.

✻ Грамадзяне Швейцарыі ў час рэферэндума прагаласавалі супраць уваходжання краіны ў Аб'яднаную Еўропу. Цікава, што жыхары нямецкамоўных кантонаў былі «супраць», а франкамоўных — «за».

Ад часовага—да пастаяннага

Беларусь атрымала статус часовага члена Еўрапейскага саюза футбольных асацыяцый (УЕФА). Рашэнне аб гэтым было прынята на прайшоўшым нядаўна пасяджэнні выканкома УЕФА ў Стамбуле. Пастаянным членам гэтай арганізацыі наша рэспубліка стане, відаць, у чэрвені 1993 года, калі адбудзецца кангрэс УЕФА.

На пасяджэнні выканкома было прынята яшчэ адно важнае рашэнне: у фінальным турніры чэмпіянату Еўропы 1996 года, які адбудзецца ў Англіі, прымуць удзел не 8, а 16 каманд.

Граніцу—на замок

На варце эканамічных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь стаяць супрацоўнікі транспартнай міліцыі, якія на 32-х прапускных пунктах кантралююць вываз сыравіны і тавараў за межы рэспублікі чыгуначным і паветраным транспартам.

Толькі на Маладзечанскім пункце работнікі транспартнай міліцыі за два месяцы не дапусцілі адпраўкі ў Літву звыш 360 цыстэрнаў мазуты і 58,5 тоны медзі, а на станцыі Ліда заблакіравалі вываз за межы Беларусі 1.300 тон металу на суму больш за 20 мільёнаў рублёў.

НА ЗДЫМКУ: на станцыі Сцяпянка ў Мінску старшы лейтэнант Сяргей МАКАРАЎ і старшы сяржант міліцыі Валерый ВІКЛЯНЧУК аглядаюць чарговы кантэйнер.

Фота Аркадзя НІКАЛАЕВА.

МЫТНІКІ БЯРУЦЬ ДОЛАРАМІ. АБО МАРКАМІ

Вірус нажывы яшчэ вельмі жывучы, з ім нялёгка змагацца. І той, хто слабы характарам, заўсёды можа трапіць на прынаду. Так адбылося і з чатырма супрацоўнікамі мытні «Заходні Буг», якія самой жа службай мытні былі западазроны ў атрыманні хабару.

Следчым аддзелам УКДБ па Брэсцкай вобласці супраць іх узбуджана крымінальная справа. Гэтыя супрацоўнікі па папярэдняй дамоўленасці з грамадзянамі Украіны аказалі ім садзеянне ў незаконнай рэгістрацыі на мытні і выдачы пасведчанняў на 12 легкавых аўтамашын, вывезеных з-за граніцы. Хабар атрымлівалі ў доларах і марках ФРГ у сумах ад 500 да 1.200 марак і ад 100 да 1.500 долараў.

Следчым аддзелам УКДБ таксама ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да намесніка начальніка Беларускага інстытута інжынерных пошукаў Барадзецкага, які незаконна вёз праз дзяржаўную граніцу тавараў агульным коштам (паводле ацэнкі мытні) больш чым на 860 тысяч рублёў.

Падраздзяленне грамадскіх сувязяў КДБ РБ.

«АЛЬЯНС-13»

ХТО І ЯК УДЗЕЛЬНІЧАЕ Ў ПЕРШАПАЧАТКОВЫМ НАКАПЛЕННІ КАПІТАЛУ

Спачатку факты з біяграфіі. Нарадзілася малое прадпрыемства «Альянс-13» у лістападзе мінулага года ў Брэсце. Падзея гэтая асабліва не афішыравалася, хоць спіс трынаццаці заснавальнікаў і варты таго, каб яго прывесці поўнасцю: Брыштэль — генеральны дырэктар МП, Кулік і Сігіневіч — работнікі гэтага прадпрыемства, Буракоўскі — дырэктар Ганцавіцкай скургалантарэйнай фабрыкі, Васілеўскі — памочнік старшыні аблвыканкома, Верамейчык — старшыня калгаса «Маладая гвардыя» Драгічынскага раёна, Глазко — дырэктар базы «Гасгандаль», Ермакоў — дырэктар базы «Бакалея», Кароль — начальнік упраўлення гандлю аблвыканкома, Палышэнкаў, Сухоцкі, Цімашэнка—намеснікі старшыні аблсельгасхарчу і Шчэрба — начальнік ОРСа НОД-3. Праўда, у студзені гэтага года рашэннем Ленінскага райвыканкома Брэста з саставу заснавальнікаў былі выключаны Кароль і Сухоцкі. Здарылася гэта якраз пасля прыняцця закона «Аб прадпрымальніцтве ў Рэспубліцы Беларусь», у парушэнне якога ўсё ж засталіся заснавальнікамі памочнік старшыні аблвыканкома і два намеснікі старшыні аблсельгасхарчу.

Сярод дазволеных сфер прыкладання сіл гэтага малога прадпрыемства — арганізацыя работы кропак грамадскага харчавання і гандлю, турыстычная дзейнасць, выпуск блокаў, вытворчасць і перапрацоўка сельгаспрадукцыі, аўтасервіс, знешні гандаль і многае іншае.

Гэтыя скупыя звесткі значна папоўніліся пасля таго, як па ініцыятыве праваахоўных органаў КРУ і падатковая камісія наведалі «Альянс-13» і праверылі яго работу.

Як адзначана ў акце кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення, асноўнымі напрамкамі дзейнасці малога прадпрыемства сталі «продаж тавараў, закупленых з аптова-гандлёвых баз «Бакалея», «Гасгандаль», «Гандальадзенне», і арганізацыя турыстычных груп у Рэспубліку Польшча». Гэта значыць усё тое, чым займаецца сёння большасць малых прадпрыемстваў і кааператываў, якія абяцалі пры рэгістрацыі заваліць рэспубліку таварамі ўласнай вытворчасці. У адносінах да «Альянсу-13» здзяўленне выклікала тое, што засноўвалі яго людзі ад улады і гаспадарчыя кіраўнікі, якія напрамую адказваюць за становішча спраў у дзяржаўным гандлі і забеспячэнне дзяржаўных магазінаў. Той жа акт праверкі КРУ сведчыць, што па стану на пачатак верасня гэтага года малым прадпрыемствам на базах «Гасгандаль» і «Бакалея» закуплена тавараў адпаведна на 1.670,8 тысячы і 429,1 тысячы рублёў, рэалізаваных праз сетку ўласных магазінаў і па безнаяўнаму разліку калгасам, прадпрыемствам і арганізацыям вобласці. А як відаць з афіцыяльных звестак АСУ гасгандлю, у першым паўгоддзі малое прадпрыемства атрымала халадзільнікі, пыласосы, пральныя машыны, бензапілы «Дружба», розны посуд, цацкі і многае іншае, чаго ў той час не знайсці было ў дзяржаўным гандлі днём з агнём.

Але гэта, так сказаць, маральны бок. У канфлікт з законам «Альянс» імкнуўся не ўступаць. Ёсць адпаведныя дагаворы, напрыклад, ад 16 снежня 1991 года, у адпаведнасці з якім тая ж база «Гасгандаль» у асобе яе дырэктара Глазко абавязана пастаўляць малому прадпрыемству тавары па заключанай спецыфіцы і па свабодных адпускных цэнах. Пад дакументам подпісы з пячаткамі: дырэктар базы Глазко і генеральны дырэктар малога прадпрыемства Брыштэль. Так практычна сам сабе (успомнім, што дырэктар базы — сярод заснавальнікаў «Альянсу») стаў адпускаць тавары з дзяржаўнага склада камерсант Андрэй Андрэевіч Глазко.

Да кастрычніка месяца на рахунак малога прадпрыемства паступіла каля двух мільёнаў рублёў прыбытку. А тое, што КРУ і падатковая інспекцыя выявілі шэраг парушэнняў у фінансавай дзейнасці, — не бяда. Ну забрана ў даход дзяржавы больш за сто тысяч рублёў — па цяперашніх мерках сума не вельмі вялікая. А шляхоў і магчымасцей для яе кампенсацыі ў заснавальнікаў МП дастаткова. Напрыклад, можна напісаць прашэнне на імя начальніка абласнога ўпраўлення гандлю, як гэта зрабіў у студзені дырэктар базы «Бакалея» Ермакоў. Папрасіў — і атрымаў дазвол на водпуск пабочным арганізацыям 200 скрынак цыгарэт, спасылаючыся на тое, што фонды гандлюючымі арганізацыямі ўжо атрыманы. Пры гэтым не забыўся ўказаць, што цыгарэты закуплены раней, а значыць — па старых цэнах. Ну, а тое, што ў апошні год цыгарэтнага багацця ў Брэсце ніхто не памятае, што, наадварот, на памяці грамадзян асенняя тытунёвыя «бунты» ў горадзе, значэння ўжо не мае.

Затое, маючы такія сувязі і знаёмствы, як у нашага героя па імені «Альянс», а галоўнае — вялікую асабістую зацікаўленасць, можна танна прыхапіць і частку дзяржаўнай маёмасці. І тут за патрэбнымі подпісамі і пячаткамі справа не стала. 2 снежня 1991 года генеральны дырэктар малога прадпрыемства напісаў на імя таго ж начальніка ўпраўлення гандлю прашэнне аказаць садзеянне ў куплі ў базы «Гасгандаль» паўпустуючага памяшкання. Гэты цыркуляр з рэзалюцыяй «караля» — «Калі няма неабходнасці трымаць пустуючае памяшканне, дазваляю прадаць»—спускаецца дырэктару базы. У Глазко, канешне ж не было такой неабходнасці, і ён дазволіў прадаць фінскі домік. Ацэначная камісія вызначыла яго канчатковы кошт у суме пяці тысяч рублёў. Так домік, практычна за бясцэнак, становіцца ўласнасцю «Альянса». Услед за гэтым жа ацэначная камісія складае акт аб кошце двух цагляных складоў у мікрараёне «Бярозаўка». Ізноў на аснове рэзалюцыі начальніка ўпраўлення гандлю аблвыканкома, які яшчэ ў пачатку года сам хадзіў у заснавальніках МПР, гэтыя склады становяцца ўласнасцю «Альянса» за 195 тысяч рублёў.

Так ліха ідзе першапачатковае накапленне капіталу. Самі сабе адпускаюць тавары з баз, самі прадаюць, купляюць па заніжаных цэнах дзяржаўную маёмасць. І няхай дэпутаты парламента гавораць аб неабходнасці стварэння роўных умоў для ўсіх грамадзян пры ўваходзе ў рынак. На тое яны і дэпутаты, каб дэбатаваць у парламенце. Там жа, дзе знаёмства і сувязі вышэй за сумленне і мараль, можна ціха і без агалоскі атрымаць выгаду за кошт іншых. Напрыклад, за кошт тых жа рабочых, якія ўкалваюць ля станка за некалькі тысяч. Між іншым, калі вярнуцца да дэпутатаў, то менавіта іх абавязак нарэшце расставіць кропкі над «і».

Іван КУКСА, кар. БЕЛІНФАРМа.

Давайце ганарыцца, што жыць яшчэ можна, і забываць пра замежны пашпарт?

АВІР — гэта такая ўстанова, якая здольна зрабіць былога савецкага чалавека проста чалавекам. Ну хоць на невялікі тэрмін — даўшы дазвол на выезд за мяжу. А ўвогуле, можа і не зрабіць: калі дзяржава ў асобе АВІРа вырашыць не траўміраваць вашу чалавечую годнасць і адмовіць вам у выездзе. Жадаючых вельмі многа, паспрабуй усім дагадзіць.

Аднак жаданне хапнуць кавалачак чалавечага жыцця настолькі моцнае, што ніякія адміністрацыйныя «низ-зя» яго не пераадолеюць. «Тэрмінова неабходна дапамога ў афармленні замежнага пашпарта» — нібыта крычыць аб'ява ў «Рэкламцы». На яе адказваюць чэргамі тэлефонныя званкі. І, безумоўна, трапляюць куды трэба. Адна пані лагодным голасам запрасіла за паслугі ў афармленні пашпарта ні многа ні мала — 60 долараў.

Не менеш трапляе на вочы і такіх аб'яў, дзе ўжо вам прапануюць выбраць краіну для падарожжа. І вы адзін за адным набіраеце ўказаныя тэлефоны. «Жадаеце выехаць за мяжу? Але ў вас няма для гэтага неабходных папер... — ноткі пранікнёнасці і спачування да вашай няўдалай ролі адразу падштурхоўваюць кінуцца на шыю гэтаму незнаёмаму чалавеку. — Як я разумею, для вас галоўнае — выехаць. Мы можам аформіць службовае падарожжа». Ах, пане дабрадзею, ратуй, родненькі, службовае дык службовае.

Каб трапіць у такую папулярную сярод грамадзян СНД Германію, пакладзі некаму ў кішэню тысяч 15 за пашпарт. Жадаеце ў Бельгію? Гэта будзе каштаваць даражэй. Натуральна, Бельгія меней вывучана нашымі турыстамі.

А некаторыя турысцкія фірмы ўвогуле бяруць у валюце. Прыкінуўшы расходы — даходы, многія вырашаюць, што падарожжа ўсё роўна. будзе карысным. Добра, калі турысты, звязаўшыся з гэтымі фірмамі, атрымліваюць тое, што ім трэба. Патэлефанаваўшы па аб'яве ў пэўны тэрмін — з 9.00 да 13.00, даведалася ад маладой дзяўчыны, што яны робяць пашпарты дзесьці за месяц праз МЗС Расіі: каштаваць гэта будзе каля пяці тысяч. Вось як зручна — за цябе аб усім падумаюць. Нават не трэба мець выклік з-за мяжы. Вырашыўшы ўдакладніць дэталі, тэлефаную зноў. У адказ чую прастадушны старэчы голас: «Яна ўжо пайшла. Прыходзіць толькі зранку, каб пакарыстацца тэлефонам».

Калі пасля такой фразы вы не насцярожыліся, то можаце апынуцца ў вельмі непрыемным становішчы: дзяўчына-дабрадзейка атрымлівае ад вас грошы і, набраўшы пэўную колькасць кліентаў, знікае. Можаце трэсці потым бабульку — гаспадыню кватэры і таго злашчаснага тэлефона, аднак ад яе вы нічога не даб'яцеся, бо яна не ведае ні імя, ні сапраўднага адраса чалавека, які карыстаўся яе кватэрай.

Таксама спакуслівымі здаліся ўмовы адной фірмы, якая назвала сябе проста «турысцкай». Праз МЗС Латвіі ўсяго за 37 долараў яна абяцала ў двухтыднёвы тэрмін падрыхтаваць службовы пашпарт. Вашы — толькі даныя і фотакарткі. Праз некалькі дзён, набраўшы той жа нумар некалькі разоў запар, для ўпэўненасці, прыйшлося жорстка расчаравацца. Ніякая фірма тут ніколі не знаходзілася! Стомлены, надарваны голас на тым баку прахрыпеў некалькі слоў, пасля якіх стала ўсё зразумела. Напэўна, з раніцы чалавек займаўся толькі тым, што высвятляў адносіны з няўдалымі кліентамі фірмы. Няшчасны...

Безумоўна, ёсць арганізацыі, якія сапраўды маглі б вырашыць вашы праблемы. Хто шукае, той знойдзе. Але ёсць адно нядрэнная правіла, абавязковае для такіх сітуацый: давярай, ды правярай. Вашы ж грошы. Акрамя грошай вы яшчэ пакінеце на памяць аб сваёй няздзейсненай мары некалькі фотакартак.

— Вельмі многа зараз такіх аб'яў, — каменціруе становішча намеснік загадчыка аддзела віз і рэгістрацый Мінгарвыканкома Уладзімір Матусевіч. — Зараз каля 80 турысцкіх фірм маюць ліцэнзіі на афармленне дакументаў для выезду за мяжу. Але ўсе турысцкія групы праходзяць праз нас. Цэны яны ўжо ўстанаўліваюць свае. У АВІРы пашпарт каштуе 600 рублёў, у тэрміновым парадку — 900. Але любая турысцкая фірма робіць свае налічэнні — за сервісныя паслугі, напрыклад. Таму і цэны ў іх розныя.

Канешне, калі пашпарта няма, а ён вельмі патрэбны, дык чалавек аддасць, колькі яму не шкада, каб атрымаць «чырвоную кніжыцу». Дарэчы, бланкі пашпартоў, якія існуюць зараз, ужо ўстарэлі, на іх пазначана прыналежнасць да СССР, якога няма. Але развал Саюза таксама адыграў сваю ролю ў тым дэфіцыце жаданых паперак, які існуе сёння: толькі два прадпрыемствы ў СНД выпускаюць бланкі для замежных пашпартоў — у Санкт-Пецярбургу і Пермі. Беларусь, на жаль, сваіх не мае.

Людзі чапляюцца за любую магчымасць выехаць за мяжу і гэтым неяк падтрымаць сваё матэрыяльнае становішча. Але, звяртаючыся ў якую-небудзь фірму, кожны павінен бачыць тарыф цэн за паслугі, каб ведаць, каму і за што ён плаціць грошы. Дзяржкамітэт па знешнеэканамічных сувязях таксама павінен устанавіць пэўны кантроль за фірмамі, каб не былі такія вялікія ваганні ў цэнах.

— Здараецца, да нас звяртаюцца наконт выезду за мяжу, — працягвае размову У. Матусевіч, — людзі з пашпартамі, атрыманымі за межамі Беларусі. Былі выпадкі, калі пашпарты рабіліся праз нейкую фірму ў Батумі. Але такія дакументы мы не разглядаем. І вымушаны адмаўляць людзям. Увогуле, мы імкнёмся сачыць за дзейнасцю гэтых фірм і правяраць аб'явы, якія з'яўляюцца ў розных рэкламных дадатках. Былі выпадкі падману людзей.

Што датычыцца ўвядзення агульнаграмадзянскіх пашпартоў, дык яно плануецца ў наступным годзе. Ці атрымаецца — іншая справа. Ужо распрацавана і форма новых бланкаў. Але іх яшчэ неабходна аддрукаваць, а потым правесці замену — напэўна, шмат часу на гэта пойдзе.

Таму, трымаючы ў руках пашпарт грамадзяніна невядома якой дзяржавы і ў думках перасякаючы мяжу, калі не ўдалося набыць замежны, давайце ганарыцца тым, што, як і ў цывілізаваных краінах, у нас на Беларусі, жыць можна. Пакуль.

Ларыса ЦІМОШЫК.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ МАЛАДЗЁЖНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ

РАМПО

ДЫЛЕР КІТАЙСКАЙ КАМПАНІІ «ЧАЙНАТЭКС» У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

ПРАПАНУЕ

за рублі аптовыя партыі ВЕРХНЯГА АДЗЕННЯ

Адгрузка са складаў у Мінску

НАБУДЗЕ

супер-МАЗы 54323, 64229

Тэлефоны для даведак: (0172) 293-077, 293-595, 293-316, 293-633

Вывучаем попыт

НА ПАДПІСКУ ЦІ НАБЫЦЦЁ замежных сродкаў масавай інфармацыі на англійскай, французскай і іншых мовах.

Дастаўка — на наступны дзень пасля выхаду.

Запіс па тэл. у Мінску 58-89-58 (з 10 да 13 гадзін).

АРГАНІЗАЦЫЯ

тэрмінова аплаціць РАХУНКІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ І НА ЎКРАІНЕ ў абмен на аплату рахункаў у Расіі.

Тэл. у Мінску 26-89-80, 26-89-14 (факс).

ДА ВЕДАМА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ СЕРТЫФІКАТАЎ БЫЛОГА АШЧАДБАНКА СССР

АШЧАДНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З 1 ЛІПЕНЯ 1992 ГОДА ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1993 ГОДА

праводзіць выкуп сертыфікатаў

былога Ашчаднага банка СССР, прададзеных установамі Ашчадбанка Беларусі.

Па сертыфікатах, набытых грамадзянамі да 1 сакавіка 1991 года, налічваецца 40-працэнтная кампенсацыя. Акрамя таго, па сертыфікатах выплачваецца даход, размер якога ў залежнасці ад тэрмінаў захоўвання вагаецца ад 5 да 16 працэнтаў гадавых.

Па жаданню ўладальнікаў сертыфікатаў атрыманыя сумы могуць залічвацца на тэрміновыя ўклады пад павышаны працэнт.

ТЭЛЕФОНЫ ДЛЯ ДАВЕДАК: 20-78-25, 26-43-03.

Ашчадны банк Рэспублікі Беларусь.

Быць ці не быць беларускаму ваеннаму часопісу?

У рэдакцыі газеты Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь «Во славу Родины» створана ініцыятыўная група, мэтай якой з'яўляецца заснаванне беларускага вайсковага часопіса «Паходня». Натуральна, паўстае пытанне: на чым грунтуецца гэтая ідэя?

У дзяржаве нашай сёння ідуць складаныя працэсы, звязаныя з увасабленнем у жыццё асноўных прынцыпаў незалежнасці. Як вядома, адным з гарантаў гэтай незалежнасці з'яўляецца аптымальнае па колькасці, баяздольнае войска, якое ў стане надзейна забяспечыць наш дзяржаўны суверэнітэт. Працэс яго стварэння распачаты, і наперадзе, безумоўна, вельмі многа цяжкай, але высакароднай працы, вынікам якой стане нараджэнне сапраўды беларускага —па духу і самасвядомасці — войска.

Бясспрэчна, што ў гэтай справе адну з вядучых роляў павінен адыграць друк, у першую чаргу вайсковы.

Пэўныя захады ў гэтым накірунку ўжо зроблены журналістамі газеты «Во славу Родины». Амаль тры гады на яе старонках друкуюцца артыкулы пад рубрыкай «Беларусь: архівы часу» (ужо ўбачылі свет звыш ста матэрыялаў), якія ўзнімаюць пытанні беларускай гісторыі, у тым ліку ваеннай.

Выйшла каля трыццаці беларускамоўных старонак «Паходні», якая знаёміць чытачоў з храналогіяй гісторыі Беларусі, беларускай геральдыкай, дойлідствам, лепшымі ўзорамі беларускай паэзіі, народнымі досціпамі, паданнямі і легендамі.

Апошнім часам «Во славу Родины» дала жыццё яшчэ адной тэматычнай старонцы— пад назвай «Айчына і вера». Матэрыялы гэтых выпускаў знаёмяць чытачоў з гісторыяй хрысціянства на Беларусі, узнімаюць праблемы сучаснавання на нашай зямлі розных рэлігійных канфесій, падаюць лепшыя ўзоры храмавага дойлідства, беларускіх абрадаў.

Трэба адзначыць, што ў рэдакцыі склалася кола журналістаў, няштатных аўтараў — навукоўцаў, краязнаўцаў, якія пішуць на ваенныя, гістарычныя, мастацка - публіцыстычныя і ваенна - патрыятычныя тэмы, добра валодаюць беларускай мовай. І галоўнае — усім сэрцам любяць Беларусь і імкнуцца, каб праз веданне мінуўшчыны сваёй зямлі, яе культуры і мастацтва, роднай мовы адрадзіць гэтую любоў, гістарычную самасвядомасць у чытачоў, у першую чаргу вайскоўцаў (дарэчы, пошта газеты па гістарычных пытаннях уступае па колькасці толькі допісам на сацыяльныя тэмы).

Вось таму і паўстала пытанне аб тым, каб даць гэтым людзям магчымасць усур'ёз заняцца высакароднай і вельмі патрэбнай ужо сёння справай — выданнем беларускага вайсковага часопіса «Паходня», які мог бы стаць дзейсным сродкам адраджэння і ўсталявання беларускасці ў нашым маладым войску.

Чаму «Паходня»? Таму што менавіта «Паходня» павінна, на наш погляд, вырываць з цемры забыцця сівую мінуўшчыну Беларусі, асвятляць шлях да адраджэння гістарычнай самасвядомасці вайскоўцаў, роднай мовы і культуры.

Натуральна, паўстае пытанне наконт таго, колькі будзе каштаваць новы часопіс. Першапачатковыя падлікі, кансультацыі з рэдактарамі некаторых беларускіх часопісаў, спецыялістамі выдавецтва «Полымя», «Беларускага Дома друку» ўпэўніваюць у тым, што «Паходня» не стане «дарагім дзіцем». Пры выхадзе 6 разоў на год (у перспектыве — штомесячна) накладам ад 3 да 5 тысяч асобнікаў (у каляровым афармленні) аб'ёмам 12 улікова-выдавецкіх аркушаў выдаткі на часопіс складуць каля 3 мільёнаў рублёў у год, што, безумоўна, не зробіць вялікай брэшы ў рэспубліканскім ваенным бюджэце.

На нашу думку, ужо ў другой палове 1993 года беларускі ваенны часопіс можа прыйсці да чытача.

Такім чынам, члены ініцыятыўнай групы і тыя, хто іх падтрымлівае (а гэта Камісія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны, Саюз пісьменнікаў, Саюз журналістаў, рэспубліканскі Савет арганізацыі ветэранаў, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, Інстытут гісторыі Акадэміі навук Беларусі, Камітэт па архівах і справаводству пры Саўміне РБ, Беларускае краязнаўчае таварыства, выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» імя П. Броўкі, гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, народныя дэпутаты Н. Гілевіч, А. Трусаў, Я. Цумараў, міністр інфармацыі А. Бутэвіч, вядомыя навукоўцы, літаратары Р. Гарэцкі, М. Касцюк, А. Мальдзіс, Г. Штыхаў, А. Ліоты, Л. Лыч, Г. Каханоўскі, Я. Саламевіч, В. Зуёнак, Б. Сачанка, Э. Ялугін і многія іншыя), упэўнены: наша рэспубліка, беларускае войска мае вострую патрэбу (і якраз сёння, а не ў перспектыве) у вайсковым часопісе, які, бясспрэчна, стане дзейсным сродкам ваенна - патрыятычнага выхавання грамадзян Беларусі, моладзі, вайскоўцаў. Тыя невялікія сродкі, якія патрэбны для стварэння і выдання «Паходні», поўнасцю кампенсуюцца актуальнасцю і высакароднасцю тых задач, што будзе вырашаць беларускі вайсковы часопіс.

Апошняе слова — за кіраўніцтвам Міністэрства абароны.

Святаслаў АСІНОЎСКІ, падпалкоўнік, адказны сакратар газеты МА РБ «Во славу Родины».

ФІЛЬМЫ ТЫДНЯ

- «НЕВЯРТАЛЬНІК»
- «І ВЯРТАЕЦЦА ВЕЦЕР...»
- «ДОМ СПАТКАННЯЎ»
- «ДЗЕВЯЦЬ З ПАЛОВАЙ ТЫДНЯЎ»

НОВАЯ КАЛЯРОВАЯ мастацкая кінастужка «НЕВЯРТАЛЬНІК» створана рэжысёрам Сяргеем Снежкіным на кінастудыі «Ленфільм» па матывах аднайменнай аповесці Аляксандра Кабакова.

Герой карціны, тэлекаментатар Андрэй Карнееў, які здымае вострасацыяльныя рэпартажы, увесь дзень матляецца паміж галадоўкамі і самазабойствамі, паміж гамасекамі, што ўсё мітынгуюць, і эратычнымі спектаклямі, паміж палітычнымі і бытавымі драмамі. Ноччу ля дзвярэй тэлестудыі да яго звяртаецца незнаёмы чалавек. Ён просіць Карнеева азнаёміцца з нейкімі дакументамі — надзвычай сакрэтнымі і важнымі. Потым аддае папку і знікае ў цемры. Рэпарцёр, які даўно ўжо прывык да прасіцеляў, раскрыў гэту папку толькі пасля таго, як убачыў труп начнога незнаёмца. Паперы аказаліся сапраўды выбухованебяспечнымі...

У фільме здымаліся добрыя артысты. Гледачы ўбачаць даўняга знаёмага Юрыя Кузняцова, які, нягледзячы на сваю стрымана-суровую творчую палітру, неаднойчы прымушаў іх перажываць ля экрана. Выдатна падабраны генералы, а Мікалай Яроменка-старэйшы, бадай, сыграў тут адну з лепшых ці нават лепшую сваю ролю. Цудоўна паказаны гэбіст, які пералапачвае біяграфію і душу Карнеева. І зусім бліскуча выканаў ролю бежанца невядомы дасюль артыст Юрый Оськін — сапраўдная знаходка. Гэта трэба бачыць.

З ЦІКАВАСЦЮ ГЛЯДЗІЦЦА новая каляровая мастацкая кінастужка «І ВЯРТАЕЦЦА ВЕЦЕР...», створаная сумесна савецкімі і амерыканскімі кінематаграфістамі. Пастаноўку карціны па свайму сцэнарыю ажыццявіў вядомы рэжысёр Міхаіл Калік. Стужка знята ў дастаткова распаўсюджаным жанры ўспамінаў. Яна дапамагае зразумець, чаму рэжысёр, паспяхова пачаўшы сваю творчую біяграфію на радзіме, паехаў з СССР, калі і чаму сюды вярнуўся. У цітрах так і напісана: мемуары. Навошта, здаецца, пісаць? Хіба мы самі не зразумелі б, што гаворка ідзе аб уласным жыцці, аб лёсе з яго цячэннем у плыні савецкай гісторыі?

Справа, відаць, у тым, што «неабавязковы» радок таксама працуе, утварае дадатковы слой сюжэту — інтанацыю сённяшняга апавядальніка, аўтара, якога няма ў кадры, які зараз, разам з намі, перагортвае старонкі сваіх успамінаў. Гэта дае яму права на горыч, усмешку, жарт, «сяброўскі шарж», якія не да месца пры прамым, нібыта аб'ектыўным узнаўленні мінулага.

У фільме здымаліся Ала Балтар, Барыслаў Брандукоў, Уладзімір Валаў, Эмануіл Вітарган, Станіслаў Гаварухін, Алег Яфрэмаў.

НОВУЮ КАЛЯРОВУЮ мастацкую кінастужку «ДОМ СПАТКАННЯЎ» стварылі кінематаграфісты студыі «Тэлефільм» кінаканцэрна «Масфільм» пры ўдзеле студыі «Д» Маскоўскай асацыяцыі пісьменнікаў-крыміналістаў.

...На раскошную загарадную вілу — падпольны «дом спатканняў» — з'язджаюцца за «зарплатай» маладыя жанчыны, «супрацоўніцы» гэтага бардэля. Але тут іх чакае навіна: аказваецца, што ўладальнік дачы Веніямін забіты, і прадстаўнікі следчых органаў затрымліваюць жанчын да высвятлення абставін справы. Пад падазрэннем грошы. Дзяржкамітэт па знешнеэканамічных сувязях таксама павінен устанавіць пэўны кантроль за фірмамі, каб не былі такія вялікія ваганні ў цэнах.

— Здараецца, да нас звяртаюцца наконт выезду за мяжу, — працягвае размову У. Матусевіч, — людзі з пашпартамі, атрыманымі за межамі Беларусі. Былі выпадкі, калі пашпарты рабіліся праз нейкую фірму ў Батумі. Але такія дакументы мы не разглядаем. І вымушаны адмаўляць людзям. Увогуле, мы імкнёмся сачыць за дзейнасцю гэтых фірм і правяраць аб'явы, якія з'яўляюцца ў розных рэкламных дадатках. Былі выпадкі падману людзей.

Што датычыцца ўвядзення агульнаграмадзянскіх пашпартоў, дык яно плануецца ў наступным годзе. Ці атрымаецца — іншая справа. Ужо распрацавана і форма новых бланкаў. Але іх яшчэ неабходна аддрукаваць, а потым правесці замену — напэўна, шмат часу на гэта пойдзе.

Таму, трымаючы ў руках пашпарт грамадзяніна невядома якой дзяржавы і ў думках перасякаючы мяжу, калі не ўдалося набыць замежны, давайце ганарыцца тым, што, як і ў цывілізаваных краінах, у нас на Беларусі, жыць можна. Пакуль.

Ларыса ЦІМОШЫК.

МАЛОЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

ПРАПАНУЕ ПАСЛУГІ

па выдавецкай дзейнасці, у тым ліку па выпуску брашур, рэкламных буклетаў, календароў на ўласнай паперы і паперы заказчыка,

ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ

на бланачную прадукцыю (цэны – ніжэй рыначных),

ДАПАМОЖА Ў ВЫДАННІ

газет,часопісаў, гатова выканаць функцыі рэдакцыйна-выдавецкага аддзела ўстановы.

Даведкі па тэл. у Мінску: 23-95-84 (з 9 да 11), 58-89-58 (з 10 да 19).

АРГАНІЗАЦЫЯ купіць безнаяўную валюту

Тэл. у Мінску 26-89-80, 26-89-14 (факс).

МІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ лексікалогіі французскай мовы (1), гісторыі англійскай мовы (1);

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ лексікалогіі французскай мовы (1), гісторыі англійскай мовы (1);

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ ад'язджаючых за мяжу (1).

Тэрмін падачы дакументаў — месяц з дня апублікавання аб'явы. Дакументы накіроўваць на адрас: 220662, Мінск, вул. Захарава, 21.

Паклапаціцеся аб сваім здароўі!

Лячэнне гіпнозам заікання, начнога нетрымання мачы, цікаў, неўрозаў, парушэння сну, імпатэнцыі.

Лячэнне хранічнага прастатыту, радыкуліту, захворванняў суставаў, трафічных язваў ног, пятачных шпораў, язвеннай хваробы страўніка.

Запіс на прыём па тэл. у г.Чэрвені 33-2-72 з 14.00 да 20.00. Урач Гурыновіч.

Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія

аб'яўляе прыём

на вячэрнія падрыхтоўчыя курсы

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю, навучэнцы 11-х класаў сярэдніх школ, выпускных курсаў тэхнікумаў, ПТВ.

У маі-чэрвені 1993 года слухачы курсаў здаюць выпускныя экзамены па матэматыцы і фізіцы. Слухачы курсаў, якія здаюць экзамен на 4 або 5, вызваляюцца ад уступнага экзамена ў БДПА па гэтаму прадмету.

Для паступлення на курсы неабходна падаць заяву на імя рэктара акадэміі і квітанцыю аб аплаце грошай за навучанне.

Прыём заяў і квітанцый па адрасу:

220027, г.Мінск, пр. Скарыны,65, БДПА, корпус 1, пакой 424.

Даведкі па тэлефоне 32-76-71.

Рэктарат.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАНАМІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:

дацэнтаў кафедраў фінансаў, арганізацыі і кіравання, таваразнаўства харчовых тавараў;

старшых выкладчыкаў кафедраў замежных моў № 1 (2 адз., англійская і французская мовы);

выкладчыка кафедры замежных моў № 1 (англійская мова);

асістэнтаў кафедраў філасофіі, фінансаў, арганізацыі прадпрыемстваў АПК.

Тэрмін падачы дакументаў на конкурс — месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: 220672, г.Мінск, Партызанскі пр., 26. Рэктару.

РАМОНТ ЭЛЕКТРАРУХАВІКОЎ

Тэл. у Мінску (0172) 45-97-49, факс 45-12-39.

КУПІМ ♦ВОЛАВА ♦ПРЫПОЙ

ТЭЛЕФОН У МІНСКУ: 32-10-45.

Згубленае пасведчанне ўдзельніка ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1986 годзе серыя А № 929532, дата выдачы 5 снежня 1991 г. лічыць несапраўдным.

Згубленае пасведчанне ўдзельніка ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС № 306040 серыя А на імя Далідовіча Валянціна Іванавіча лічыць несапраўдным.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 снежня

Беларускае тэлебачанне

17.00. «Мсціўцы з 2-га «В», «Мой сябар Кнопік, які ведае ўсё». Кароткаметражныя фільмы.
17.45. «Заяц, Скрып і скрыпка». Мультфільм.
18.00. «Данчык». Дак. фільм.
18.30. Гарачая справа. Чаму ліхаманіць беларускую металургію?
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Паэтычная гасцёўня. Новыя вершы С. Грахоўскага.
19.25. Рамансы С. Рахманінава выконвае І. Архіпава.
19.40. Эканамічная хваля. Як жывецца селяніну? Перадача з Гродна.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. «Рыцары неба». Мастацкі фільм (Францыя). 9-я серыя.
22.10. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; «Нялёгка з мужчынамі». Мастацкі фільм (Югаславія).

Канал «Астанкіна»

17.00. Навіны.
17.25. Міждзяржаўны тэлеканал «Астанкіна» прадстаўляе.
18.00. Маст. фільм «Жазэф Бальзамо». 5-я серыя.
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.45. Літаратурная прэмія Букера ў Расіі.
21.00. Вершы і песні А. Нікольскага выконвае І. Мірашнічэнка.
22.00. Футбол. Кубак УЕФА. «Бенфіка» (Партугалія) — «Дынама» (Масква). У перапынку (22.50) — Навіны.

Канал «Расія»

17.30. Дзённік з'езда.
17.45. Залатая галінка. «Стырнавая кніга».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. Плошча мастацтваў. Кампазітар С. Губайдуліна.
21.00. Справаздача аб рабоце VII з'езда народных дэпутатаў Расійскай Федэрацыі.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Справаздача аб рабоце VII з'езда народных дэпутатаў Расійскай Федэрацыі.
23.35. «Джаз-філармонік-хол». Біг-бенд (Галандыя). Перадача 2-я.

9 снежня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вяцкія карункі». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 10-ы клас.
9.30. «Культура». Тэлечасопіс (паўтор).
10.15. «Рыцары неба». Мастацкі фільм (Францыя). 8-я серыя.
16.00. Водная пола. Кубак Чарнаморска-Балтыйскай лігі.
16.30. «Дзве Бабы-Ягі». Спектакль. Магілёўскага аблдрамтэатра.
17.25. «Па шчупаковаму загаду», «Ах, прынцэса!», «Вяроўка». Мультфільмы.
18.00. «Альманах кінападарожжаў».
18.20. «Пейзаж на фоне сцяны...», «Казахстанскі фарфор». Дак. фільмы.
18.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. Бар'еры. Праблемы спартыўнага клуба інвалідаў.
19.55. Іграе Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». Мастацкі фільм (Францыя). 10-я серыя.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; «Паездка ў Вісбадэн». Мастацкі фільм.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. Мастацкі фільм «Жазэф Бальзамо». 6-я серыя.
9.20. Футбол. Кубак УЕФА. «Бенфіка» (Партугалія) — «Дынама» (Масква).
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Чыста англійскае забойства». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
12.40. «Вось... зноў Насрэдзін». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. «Пчала Мая».
15.40. Дак. фільм.
16.10. Тэніс. Кубак «Вялікага шлема».
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. «Песня калінавая». Перадача з Чарнаўцоў.
17.45. Мастацкі фільм «Жазэф Бальзамо». 6-я серыя.
18.45. Аўтарская праграма Ю. Паніча. «Дарога дамоў». «Мяркуйце самі».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Ведзі.
21.00. Футбол. Ліга чэмпіёнаў. ЦСКА — «Глазга рэйнджэрс».
23.20. Навіны.
23.40. Футбол. Ліга чэмпіёнаў.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Залатая галінка. «Стырнавая кніга».
9.00. В.-А. Моцарт. Сімфонія «Ля-мажор».
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Плошча мастацтваў. Кампазітар С. Губайдуліна.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Сігнал.
15.15. Далёкі Усход.
16.00. Там-там навіны.
16.15. Мульці-пульці.
16.30. Ці патрэбны сёння Ляўша?
17.00. Хрысціянская праграма. Званы пекла.
17.30. Дзённік з'езда.
17.45. «Снег — лёс мой». (Нарыльск. Гады. Людзі). 2-я серыя.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.20. Студыя «Сатырыкон». С. Альтаў.
20.50. Экран крымінальных паведамленняў.
21.00. Справаздача аб рабоце VII з'езда народных дэпутатаў Расійскай Федэрацыі.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Справаздача аб рабоце VII з'езда народных дэпутатаў Расійскай Федэрацыі.

Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з выпадку заўчаснай смерці Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Мікалая Іванавіча ІГНАТОВІЧА і выказвае спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

НАДВОР'Е

8 снежня

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з ападкамі надвор'е. Максімальная тэмпература паветра ў Віцебску, Магілёве, Гомелі — 0—2, Мінску, Гродна — 2—4, Брэсце — 3—5 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак у асноўным без ападкаў, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы 1—6 градусаў марозу, пры праясненнях — да мінус 10, удзень — ад 3 градусаў марозу да 2 — цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91. Тэлефакс: 32-22-03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.098. Індэкс 63.850. Зак. № 243. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12